№ 20 (570) 29 траўня 2008

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднаўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Пуцін ізноў шантажуе Беларусь

Масква гатовая абмеркаваць новы крэдыт для Лукашэнкі, але патрабуе ўзамен эканамічных саступак.

Старонка 3

## Адкуль наш род

Аўдыёкніга для кожнай беларускай сям'і.

Старонка 10



## Генадзь Бураўкін

не настальгуе па савецкіх часах. Гутарка з паэтам.

Старонка 11

**У НУМАРЫ**

**Сярэдні заробак у Расеі дасягнуў 688 даляраў**

А ва Ўкраіне — 368. **Старонка 2.**

**На Заходнім фронце безь пераменаў**

Мілінкевіч і Севярынец зь візытам у Брусэлі, а лідэры палітычных партый — у Варшаве. **Старонка 3.**

**Узаконенае забойства**

«Ну, забойства дык забойства, часам бываюць такія жыцьцёвыя сытуацыі», — кажуць некаторыя. Дыскусія пра аборты — піша Кастусь Шыталь. **Старонка 5.**

**Верхняму гораду пагражае спрэчка сылюэтаў**

З нагоды плянаў пабудовы 35-павярховага гатэлю ў цэнтры Менску піша архітэктар Ігар Байцоў. **Старонка 13.**

**Прыгажосьць уратуе кіроўцаў**

У Віцебску ў якасьці рэгуліроўшчыц выставяць прыгожых дзяўчат. **Старонка 14.**

**Гавал вярнуўся ў драматургію**

Чаму страта ўлады азначае для некаторых страту сэнсу жыцьця? Пра гэта новая п'еса экс-прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла. **Старонка 11.**

# Краіну згубілі і не заўважылі

На сцэне Купалаўскага Мікалай Пінігінператварыў вадэвіль «Пінская шляхта» ў гістарычную драму цэлага народу. **Старонка 2.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Нашыя пэнсіі сёньня і заўтра

Усё больш беларусаў, але яшчэ ня большасьць, гатовыя да пераходу на назапашвальную пэнсійную сыстэму. Дасьледніцкі цэнтар Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту зрабіў адмысловае дасьледаваньне праблемы.

Ці хапае сёньня на жыцьцё беларускаму пэнсіянэру? Што сабе думаюць пэнсіянэры заўтрашнія? Ці турбуецца пра будучыню моладзь? Як сучасныя беларусы ставяцца да пэнсіі? І хто, на іх думку, павінен клапаціцца пра яе памер і рэгулярнасьць? На гэтыя пытаньні спрабавалі адказаць спэцыялісты дасьледчыцкага цэнтру Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту (ІПМ) Аляксандар Чубрык і Марына Батурчык, якія аналізавалі праблему на падставе дадзеных адмысловага нацыянальнага апытаньня.

### Рэформа нежаданая, але насьпелая

У Беларусі дзейнічае разьмеркавальная пэнсійная сыстэма. Яна заснаваная на выплаце пэнсіяў за кошт сродкаў, атрыманых ад падаткаабкладаньня фонду зарплаты працоўных. Як усе падобныя сыстэмы, яна мінімізуе адказнасьць работніка за сваю будучыню, бо залежыць ад стажу, статусу і даходу.

Цяпер, калі на аднаго пэнсіянэра прыпадае менш як два занятыя, сыстэма балянсуе паміж патрэбамі непрацаздольнага насельніцтва і інтарэсамі працоўных. А ва ўмовах павелічэньня дэмаграфічнай нагрузкі трымаць балянс робіцца ўсё цяжэй. Усё больш мэтазгоднай падаецца рэформа пэнсійнай сыстэмы, а менавіта — надбудова другога (назапашвальнага) узроўню. Аднак усякія зьмены сыстэмы сацзабесьпячэньня часта ўспрымаюцца насельніцтвам як непажаданыя. Адмена сацыяльных палёгкаў — яскравы гэтаму прыклад.

Дасьледчыцкі цэнтар ІПМ зладзіў летась нацыянальнае апытаньне, якое мела мэтай выяўленьне стаўленьня насельніцтва да пэнсійнай сыстэмы, да магчымасьці яе зьмяненьня, а таксама ацэнку паводзінаў у гэтай сфэры. Былі апытаныя 1148 рэспандэнтаў у веку 18—75 гадоў ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Працяг на старонцы 4.**

**Не для ўсіх пэнсія азначае тэлевізар+дачу. Актывісткі нацыянальнага руху — старонка 8.**



Завершыцца пагрузка, і на сцэну выедзе велічэзны воз, дзе сярод мяхоў прымосьціцца маленькі расейскі чыноўнічак, які зрабіў сваю справу.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Краіну згубілі і не заўважылі

У тэатры імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера спэктаклю рэжысэра Мікалая Пінігіна паводле фарсу–вадэвілю Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча «Пінская шляхта».

І гэтым разам, як звычайна, калі паказвае прэм'еру Мікалай Пінігін, у залі Купалаўскага тэатру не было дзе носа ўбіць. Ізноў — забытая айчынная клясыка. Ізноў — ашаламляльны посьпех, сакрэт якога Пінігін даўно адкрыў: ня вельмі аддаляючыся ад клясычнага тэксту і нацыянальнай сцэнічнай традыцыі, знайсьці актуальную ідэю ў старым творы, весьці яе да фіналу, дзе паставіць грандыёзны пластычны эпілёг.

Так здарылася і зь «Пінскай шляхтай» — п'есай, якую звычайна ставілі аматарскія калектывы. А вось жа ў XXI стагодзьдзі, у новай Беларусі ёй знайшлося месца на першай драматычнай сцэне краіны. Прымітыўныя з гледзішча сучаснай драматургіі сюжэтныя хады і дыялёгі адной зь першых беларускіх п'есаў не перашкодзілі рэжысёру і вярнуць сучаснаму беларусу забыты тэкст, і прыдумаць спэктакль вострага сучаснага гучаньня. Пінігін ня быў бы Пінігіным, каб было інакш. Так было з трыма папярэднімі спэктаклямі на купалаўскай сцэне — «Тутэйшымі» Янкі Купалы, «Ідыліяй» Дуніна-Марцінкевіча і «Сымонам-музыкам» Якуба Коласа.

Амаль паўтары гадзіны дзея разьвіваецца ў традыцыі фарсу-вадэвілю. Акторы падрабязна, са смакам іграюць аперэтку. На фоне традыцыйнага насьценнага дыванка з выявай беларускіх краявідаў «ад мора да мора» ў абрамленьні расьліннага арнамэнту акторы сьпяваюць куплецікі, танчаць, тэатралізуюць маналёгі. Магчыма, занадта падрабязна, але ж артысты-купалаўцы відавочна засумавалі па клясычным нацыянальным рэпэртуары.

Гледачам хапае часу пасьмяяцца, суправадзіць кожную сцэну плясканьнем у далоні, з настальгіяй успомніць былых майстроў купалаўскай сцэны, якія вось гэтак жа маляўніча гралі ў народных камэдыях.

І ў «Пінскай шляхце», традыцыйна для пастановак Пінігіна, у галоўнай ролі станавога прыстава Кручкова — Віктар Манаеў. Карыкатурны на пачатку, ягоны Кручкоў пад фінал вырастае да знаку ўлады-акупанта, улады-рабаўніка, якая разам з апошняй капейчынай забярэ і сьвядомасьць, і годнасьць, і краіну. Ды так хітра, што ня толькі шараговы народ, а і эліта гэтага і не заўважаць.

Сатыру Дуніна-Марцінкевіча на беларускую шарачковую шляхту і на царскіх чыноўнікаў-кручкатвораў Пінігін выводзіць на гістарычную драму цэлага народу. Праз паўтара стагодзьдзя мы значна больш ведаем пра тое, пра што пісаў клясык. А менавіта: што «временное присутствие» і фанабэрыстасьць мясцовай шляхты сталі прычынай згубы колісь магутнай, а пасьля абрабаванай расейскімі акупантамі дзяржавы.

З гэтага веданьня і паўстае эпізод, калі Кручкоў Манаева лісьлівым тонам будзе тлумачыць шляхце, што ён жа ім родны, а над іх галовамі праплывуць цюкі з нарабаваным дабром. Завершыцца пагрузка, і на сцэну выедзе велічэзны воз, дзе сярод мяхоў прымосьціцца маленькі чыноўнічак, які зрабіў сваю справу. Прадстаўнік расейскай улады скраў усё, нават гадзіньнік — час.

Ён яшчэ абавязкова вернецца, бо пасьпеў перад ад'ездам нацкаваць чарговую пару шляхціцаў і падкінуць ім калы, як трэскі ў вогнішча. І ў разгорнутым эпілёгу, зноў жа традыцыйным для Пінігіна, шляхцюкі чарговым разам будуць дубасіць адзін аднаго, аж пакуль не зразумеюць, што страцілі краіну, якая колісь мела вялікую моц. Ачуўшыся, яны дастануць прыхаваныя на целе штандары знакамітых і ўплывовых шляхецкіх родаў, наматаюць іх на тыя ж калы, як анучы на швабры, а пасьля распрастаюць іх, велічных, на крыжах.

Ідэі спэктаклю рэжысёр Пінігін і не хавае. Ён падае яе наўпрост — у мізансцэнах, жэстах, касьцюмах, рэквізыце. Вось толькі адзін прыклад такой вобразнасьці. Кручкоў штампуе свае пастановы велічэзнай пячаткай у выглядзе пазалочанага двухгаловага арла, а Пісульнік прыборам у выглядзе зноў жа пазалочанай гільятыны абразае паперкі з прысудамі шляхце, нібы яе галовы...

Віншуючы рэжысэра з чарговым посьпехам, я нагадаў яму, што ўжо даўно няма ў рэпэртуары купалаўцаў найлепшай, як з майго гледзішча, беларускай драмы «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы. Мікалай Пінігін адказаў: «Буду мець на ўвазе, але гэта залежыць ад тэатру».

**Вячаслаў Ракіцкі, радыё «Свабода»**

## СЬЦІСЛА

### На адваката Зэльцэра вешаюць наркотыкі

Амэрыканскі юрыст Эмануіл Зэльцэр знаходзіцца пад сьледзтвам у Беларусі па справе аб выкарыстаньні падробных дакумэнтаў. Цяпер яго вінавацяць яшчэ і ў кантрабандзе наркотыкаў. Маюцца на ўвазе нейкія лекі, якія ён не паказаў у мытнай дэклярацыі. Зэльцэр прылятаў у Менск парадкаваць справы ўласнасьці магнатаў Беразоўскага і Патаркацышвілі. Новае абвінавачваньне можа мець мэтаю выбіць зь вязьня нейкія прызнаньні.

### Нашчадкі Батуры вяртаюцца

Цырымонія адкрыцьця пасольства Вугоршчыны ў Беларусі пройдзе 3 чэрвеня ў Менску. Аб гэтым паведаміў пасол Фэрэнц Контра.

### Шасьцігадовы гвалціў...

Каб запалохаць намесьніка кіраўніка «Руху "За Свабоду"» Юрася Губарэвіча, не прыдумалі нічога лепшага, як дапытаць яго... па справе згвалтаваньняў, што ажыцьцяўляліся ў Драгічынскім, Бярозаўскім і Менскім раёнах ад 1984 да 1994-га. Чорны гумар у тым, што Губарэвіч нарадзіўся ў 1978 г. Ён накіраваў скаргу ў пракуратуру на беспардонныя дзеяньні міліцыі.

### У Бэрліне помнік гомасэксуалістам

Бэтонны куб у памяць геяў-ахвяраў нацысцкага рэжыму усталяваны насупраць мэмарыялу Галакосту. Гітлерцы вынішчалі асобаў аднаполай сэксуальнай арыентацыі, як і камуністаў, габрэяў, цыганоў, інвалідаў. Геяў, аднак, доўга ня згадвалі ў ліку ахвяраў нацызму.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Праўда пра Сэндлерову павінна быць уся

**Добра, што Вы напісалі пра Ірэну Сэндлерову (№19). Што было б, каб не было на сьвеце такіх герояў?**

Гаворачы пра яе, мусім гаварыць усю праўду. Пасьля вайны, калі Польшча аказалася пад Саветамі, Сэндлерова была яшчэ раз арыштаваная. Калі гестапаўцы на допытах пераламалі ёй ногі, то Саветы ў турме так зьбівалі, што яна страціла дзіця.

У вайну гэтая полька, маючы на руках уласнае дзіця, рызыкуючы жыцьцём, выратавала 2500 габрэйскіх дзяцей. І пасьля вайны яна хацела ўсынавіць адно зь іх, бацькі і ўсе сваякі якога загінулі. Аднак гэта забаранялася законамі камуністычнага ўраду. І яна два гады трымала тое дзіця нелегальна.

Дзьве таталітарныя сыстэмы — нацысцкая і савецкая — былі аднолькава нялюдзкія, толькі што апошняя лепш умела маскавацца пад прыгожымі словамі.

**Віктар Пархімчык, Варшава**

**Іншыя лісты з пошты Рэдакцыі — старонка 10.**

## Сярэдні заробак у Расеі дасягнуў 688 даляраў

А ва Ўкраіне — 368.

Сярэдняя налічаная зарплата ў Расеі ў красавіку 2008 году склала 16 253 расейскіх рублёў. За год яна вырасла на 28,1%. Такія зьвесткі распаўсюдзіў Расстат. У сакавіку заробак складаў 16 72 тыс. рублёў.

Нават у самай нізкааплочванай сфэры — сельскай гаспадарцы — заробак перавысіў 300 даляраў (7 123 рублёў). За даляр на сёньня даюць 23,6 рубля.

Рост заробкаў працягваецца ва ўсім рэгіёне як у нацыянальнай валюце, так і ў даляравым эквіваленце. У нацыянальнай валюце ён вынікае як з росту эканомікі, так і з росту прадукцыйнасьці працы. У даляравым эквіваленце ж заробкі ўзрастаюць яшчэ і з прычыны падзеньня курсу даляра адносна расейскага рубля, грыўні ды большасьці іншых валютаў Усходняй Эўропы.

Ва Ўкраіне ў красавіку сярэдні заробак узрос да 1750 грыўняў, што роўна 362 далярам. Прычым у Кіеве ён перавысіў 650 даляраў.

Варта адзначыць, што доля заробкаў у агульных даходах насельніцтва тым меншая, чым большая доля прыватнага сэктару ў краіне.

**МБ**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Ці Вам падабаецца, што папяровая «НН» вярнулася ў вялікі фармат?

| | |
|---|---|
| так | 124 (74.3%) |
| не | 22 (13.2%) |
| я дасылаю грошы на газэту, але чытаю толькі ў нэце | 21 (12.6%) |

Усяго прагаласавала: 167

# Пуцін ізноў шантажуе Беларусь

Напярэдадні саміту кіраўнікоў урадаў СНД у Менску «крыніца ў расейскім урадзе» распаўсюдзіла інфармацыю, што Расея гатовая абмеркаваць новы льготны крэдыт для Беларусі, але патрабуе ўзамен эканамічныя саступкі.

Пад «саступкамі» маецца на ўвазе прапанова падзяліцца з расейскімі інвэстарамі чарговай порцыяй прывабных актываў, на гэты раз — прадпрыемствамі машынабудаваньня. Як сфармуляваў расейскі ўрад, «Беларусь здолела б пераадолець нэгатыўныя наступствы росту цэнаў, калі б пашырыла супрацу з РФ ва ўсіх сфэрах».

23 траўня ў Менску ў памяшканьні Нацыянальнай бібліятэкі адбылося пасяджэньне Рады краўнікоў урадаў дзяржаваў СНД.

На яго прыбылі дэлегацыі Казахстану, Таджыкістану, Азэрбайджану, Арменіі, Кіргізстану, Малдовы, Расеі, Украіны, Узбэкістану, Грузіі і Туркмэністану.

Саміт стаў нагодай для першых візытаў Юліі Цімашэнкі і Ўладзімера Пуціна ў Менск у рангу прэм’ер-міністраў.

Дарэчы, падчас перамоваў з Ю.Цімашэнкай Сяргей Сідорскі падарыў ёй букет аранжавых ружаў.

Што да новага-старога прадстаўніка Расеі, то Ўладзімір Пуцін дзейнічаў у сваім амплюа. Напярэдадні саміту «крыніца ў расейскім урадзе» распаўсюдзіла праз інфармацыйныя агенцтвы інфармацыю, што Расея гатовая абмеркаваць новы льготны крэдыт для Беларусі на аплату газу, што ўсё даражэе, але для кампэнсацыі наступстваў росту цэнаў прапануе «саюзьніцы» падзяліцца з расейскімі «інвэстарамі» чарговай порцыяй прывабных актываў, на гэты раз — прадпрыемствамі машынабудаваньня. У тым самым стылі «крыніца ў Адміністрацыі прэзыдэнта Расеі» зьлівала патрабаваньні Крамлю ў часы, калі там сядзеў Пуцін.

Масква гатовая «абмяркоўваць цану газу зь Менскам», — паведаміла крыніца, — але зыходзячы пры гэтым зь «нязьменнасьці цэнаў, прадугледжаных кантрактамі... з формуламі цэнаў».

Што ж мусіць адбыцца, каб формулы цэнаў далі нізкую канчатковую лічбу? Расейскі ўрад тлумачыць: «Расея цяпер выступае ў гэткай нібыта падвойнай ролі: з аднаго боку, фінансава спрыяе Беларусі, доўгі час ільготнымі цэнамі і крэдытамі і гэтак далей, але зь іншага боку, структура гандлю такая, што мы, па сутнасьці, сыравінны прыдатак Рэспублікі Беларусь». Таму «ступень выраўноўваньня гандлёвага дысбалянсу будзе крытэрам, зыходзячы зь якога РФ вырашыць, ці даць яшчэ адзін «беспрэцэдэнтны крэдыт» Беларусі — калі тая папросіць», — тлумачыць ход думкі ўраду Пуціна агенцтва «Ройтэрз».

«Беларусь можа гэтае пытаньне паставіць, гэта яе права, але падрыхтоўка рашэньня аб крэдыце — справа вельмі сур’ёзная... Нам важна, каб крэдыт... спрыяў нашай эканамічнай інтэграцыі... Нам важна, каб гэтыя крэдыты ішлі на мэты рэфармаваньня структуры нашага замежнаэканамічнага аб’ёму».

У далікатнай фармулёўцы расейскага ўраду, «Беларусь здолела б пераадолець нэгатыўныя наступствы росту цэнаў, калі б пашырыла супрацу з РФ ва ўсіх сфэрах».

«Ёсьць інтарэсы ў расейскіх кампаніяў да працы на беларускім рынку», — паведаміла крыніца. «Гэтак, возьмем грузавікі і сельгасмашынабудаваньне: і ў Расеі, і ў Беларусі добрыя гіганты ў гэтай вобласьці, і мы паасобку цяпер быццам бы выходзім на сусьветны рынак... Калі мы свае высілкі там аб’яднаем, у нас ёсьць добры шанец стаць вельмі сур’ёзным гульцом на сусьветным рынку».

**Мікола Бугай**

# На Заходнім фронце безь пераменаў

Мілінкевіч і Севярынец зь візытам у Брусэлі, а лідэры палітычных партыяў — у Варшаве.

Лідэр «Руху «За Свабоду» Аляксандар Мілінкевіч і старшыня аргкамітэту па стварэньні Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Павал Севярынец сёньня ў Брусэлі сустрэнуцца з старшынём Эўрапейскага парлямэнту Гансам-Гертам Пётэрынгам.

Афіцыйна паведамляецца, што сустрэча зьвязаная зь перадачай беларускімі палітыкамі ў Эўрапарлямэнт 50 тысячаў подпісаў незадаволеных законам «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацый». Раней гэтыя подпісы былі перададзеныя ў Адміністрацыю прэзыдэнта, Канстытуцыйны суд і палату прадстаўнікоў.

Вядома, што размова між беларускімі палітыкамі і Гансам-Гертам Пётэрынгам пойдзе ня толькі пра ўціск правоў вернікаў у нашай краіне. Аднак астатнія аспэкты гутаркі з эўрачыноўнікам, пакуль не афішуецца.

У сваю чаргу дэлегацыя Аб’яднаных дэмакратычных сілаў знаходзіцца з чатырохдзённым візытам у Варшаве. У сталіцу Польшчы накіраваліся старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі, невыязны лідэр АГП Анатоль Лябедзька (пакуль невядома, як ён дабраўся ў Варшаву), выканаўца абавязкаў старшыні БСДП Анатоль Ляўковіч, лідэр ПКБ Сяргей Калякін, а таксама адзін з кіраўнікоў «Руху «За свабоду» Віктар Карніенка.

Плянуецца, што цягам візыту палітыкі сустрэнуцца зь міністрам замежных справаў Польшчы Радаславам Сікорскім і ягоным намесьнікам Анджэем Крэмерам. Таксама будуць сустрэчы ў канцылярыі прэм’ер-міністра Дональда Туска, Міністэрстве культуры, Сэнаце і Сойме Польшчы.

У аўторак з раніцы ўжо адбылася адна з заплянаваных сустрэч. У Варшаўскім унівэрсытэце палітыкі мелі размову з кіраўніком стыпэндыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага доктарам Янам Маліцкім. «Мы прасілі польскі бок па магчымасьці дапамагаць нашым юнакам і дзяўчатам лепш акліматызавацца ў чужой краіне», — кажа В.Карніенка.

Цікава, што візыт беларускіх палітыкаў у Варшаву арганізавала польскае МЗС. Але гэты момант не афішуецца. Гэта характэрна для манеры вядзеньня замежнай палітыкі Тускам-Сікорскім. Урад Качыньскага дзейнічаў дэманстратыўна, а ўрад лібэралаў імкнецца не дражніць гусей.

Скончыцца візыт 30 траўня.

**Зьміцер Панкавец**

# Казахстан прапануе Расеі сяброўства безь Беларусі

Першы свой замежны візыт у якасьці прэзыдэнта Расеі Дзьмітры Мядзьведзеў зрабіў у Казахстан.

Расейская прэса назвала вяжнаваабранага прэзыдэнта ў Казахстан знакавым. Маўляў, аддаючы перавагу Астане перад Пэкінам, Расея дэманструе перавагу сваіх інтарэсаў на постсавецкай прасторы.

Паводле зьвестак газэты «КомерсантЪ», у ходзе перамоваў Нурсултан Назарбаеў меў намер узьняць пытаньне пра інтэграцыю эканомік Расеі і Казахстану. Фактычна, Назарбаеў прапануе Маскве вярнуцца да ідэі Адзінай эканамічнай прасторы, піша выданьне. Але гэтым разам Астана настойвае на тым, што АЭП-2 варта будаваць без удзелу Беларусі і Ўкраіны, якія «больш замінаюць, чым спрыяюць інтэграцыі».

Расея мае ня менш амбіцыйныя пляны наконт Казахстану. Найперш у энэргетычнай сфэры. Казахстан яе цікавіць у якасьці адната з акцыянэраў нафтаправоду БТС-2. У Астану накіравалі адпаведныя прапановы і да апошняга не выключалася, што яны будуць разгледжаныя ў часе сустрэчы прэзыдэнтаў. Нагадаем, што 14 траўня новы прэм’ер Расеі Ўладзімір Пуцін паведаміў пра канчатковае рашэньне на карысьць пабудовы нафтаправоду.

Аднак, як аказалася па выніках сустрэчы, пляны Назарбаева не знайшлі належнага водгуку ў расейскіх уладаў, а Масквы — у казахскіх. Бакі падпісалі ўзаемавыгадную дамову аб пабудове прыкаспійскага газаправоду і пашырэньне магутнасьцяў трубаправоду «Цэнтральная Азія — Цэнтар», а таксама шэраг дамоўленасьцяў у сфэры атамнай энэргетыкі і касьмічнага супрацоўніцтва.

**Сямён Печанко**

### Вынікі энэргасаміту ў Кіеве

«Пастаўка нафты з Каспійскага мора ў Цэнтральную Эўропу праўдападобная, але не гарантаваная», — так падвяла вынікі энэргетычнага саміту ў Кіеве польская «Газэта выборча». У саміце ўзялі ўдзел прэзыдэнты Ўкраіны, Польшчы, Румыніі, Малдовы, краінаў Балтыі, Грузіі і Азэрбайджану. Каналам пастаўкі мае стаць нафтапravод Адэса—Броды, але пытаньнем застаецца наяўнасьць вольнае сыравіны ў Азэрбайджане і Казахстане. Апошні вычэкае. За ягоную нафту патэнцыйна будуць змагацца Масква і Цэнтральная Эўропа. Характэрна, што візыт Мядзьведзева ў Астану не прывёў ні да якіх гучных дамоўленасьцяў.

## СЬЦІСЛА

### Беларусь запрасіла Расею, Францыю, ЗША да будаўніцтва АЭС

Беларусь накіравала прапановы Расеі, Францыі, ЗША па ўдзеле ў будаўніцтве АЭС. Аб гэтым паведаміў намесьнік дырэктара РУП «БелНДІПэнэргапрам» (генэральны праектоўшчык па стварэньні АЭС у Беларусі) Уладзімер Баброў. Тэндэр на будаўніцтва АЭС пакуль не аб’яўлены.

### Будзе канкардат з Ватыканам

Беларусь рыхтуецца да падпісаньня канкардату з Ватыканам, заявіў у Горадні ў часе сустрэчы з журналістамі ўпаўнаважаны ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Леанід Гуляка. Пагадненьне паміж РБ і Ватыканам замацуе прававыя нормы дачыненьняў дзяржаваў.

### У Польшчы страйк настаўнікаў

Польшча застаецца краінай з самымі моцнымі прафсаюзамі і арганізаванымі работнікамі ў Цэнтральнай Эўропе. Таму ў краіне адбываецца страйк за страйкам. 27 траўня спынілі працу 2/3 ўсіх школаў краіны. У большасьці працуюць толькі кіраўнікі, групы падоўжанага дня і манашкі-выхавацелькі.

Сярэдні заробак настаўніка ў Польшчы складае на сёньня 3200 злотых ($1480) пры сярэднім заробку па краіне $1350. Пэнсія настаўніка складае 1300 злотых ($600). Пэдагогі патрабуюць павышэньня і платы, і пэнсіяў.

Урад Туска абяцае далейшы рост заробкаў, але расьцягнуты на 3 гады — згодна зь ягоным плянам, зарплаты пэдагогаў маюць узрасьці на 50% да 2011 г.

Базавая нагрузка настаўніка складае ў Польшчы 18 гадзінаў на тыдзень. Таксама настаўнікі маюць права на датэрміновы выхад на пэнсію. Вакол гэтай нормы ідзе барацьба: урад хоча яе скасаваць, настаўнікі дабіваюцца захаваньня.

**МБ**



**У Кітаі — наймацнейшая за 30 гадоў сэрыя землятрусаў. Пад ціскам разгневаных бацькоў камуністычныя ўлады пагадзіліся правесьці сьледзтва ў справе якасьці пабудовы школаў. У многіх гарадах правінцыі Сычуань прыватныя дамы вытрымалі, а школы й заводы скалаліся ў купы друзу. Колькасьць ахвяраў перавышае 80000 чалавек.**

# Нашы пэнсіі сёньня і заўтра

Працяг са старонкі 1.

### Адна баба сказала

Сярод задачаў апытаньня было высьвятленьне крыніцаў ведаў беларусаў пра пэнсійную сыстэму. Вынікі апытаньня, як і вынікі праведзеных раней фокус-груп, паказалі, што для беларусаў па-ранейшаму натуральным ёсьць уяўленьне, што пэнсіі выплачваюцца зь бюджэту не ў адпаведнасьці з заканадаўчымі нормамі, а ў залежнасьці ад жаданьня дзяржавы, якая «*вырашае, колькі плаціць*». Нязначны лік удзельнікаў дэманстраваў разуменьне таго, што пэнсійныя адлічэньні могуць прыносіць дывідэнды. Большасьць жа не ўспрымала пэнсійныя адлічэньні як інвэстыцыі, спосаб зарабіць сабе большую пэнсію. Пры гэтым удзельнікі фокус-груп, у першую чаргу людзі сярэдняга веку, разумеюць сутнасьць размеркавальнай і назапашвальнай сыстэмаў, аддаючы перавагу апошняй.

### Ідэал — жыцьцё заходніх пэнсіянераў

Узровень пэнсіі ацэньваецца як годны ў тым разе, калі ўяўленьні пра яе жаданы і фактычны памер супадаюць. Вынікі апытаньня сьведчаць, што большасьць беларусаў (69,2%) лічаць пэнсію нізкай ці даволі нізкай. Да гэтай катэгорыі часьцей адносяцца апытаныя з больш высокім прыбыткам і узроўнем адукацыі, а таксама работнікі недзяржаўных прадпрыемстваў. Каля траціны (27%) мяркуюць, што пэнсія сярэдняя і дазваляе купляць усё неабходнае. І толькі нязначны адсотак беларусаў (1,5%) лічаць пэнсію дастаткова высокай.

Варта адзначыць, што эталёнам ацэнкі годнага ўзроўню жыцьця для рэспандэнтаў ёсьць ня нейкі абстрактны ідэал, а прыклад пэнсіянера на Захадзе, які ня толькі задавальняе свае штодзённыя патрэбы на высокім узроўні, але і вядзе актыўны лад жыцьця — падарожнічае, глядзіць сябе, мае хобі. Аднак упэўненасьці ў тым, што ў пэрспэктыве падобныя ўмовы складуцца ў Беларусі, няма нават у моладзі.

### Рукі прэч ад пэнсіянера!

Пераважная большасьць насельніцтва (каля 75%) мяркуе, што пэнсійны ўзрост (даволі нізкі паводле міжнародных стандартаў — 55 гадоў у жанчын і 60 — у мужчын) — аптымальны і не патрабуе зьменаў. Кожны пяты беларус лічыць магчымым і ранейшы выхад на пэнсію. Толькі 2,6% апытаных думаюць інакш.

Нізкі ўзровень пэнсіі робіць актуальнай магчымасьць для пэнсіянераў працягваць працу. У сувязі з гэтым цікавым падаецца той факт, што ў сукупнасьці 70% рэспандэнтаў выказваюцца за тыя ці іншыя абмежаваньні ў працы пэнсіянераў, успрымаючы іх як рэзэрв на непапулярныя працоўныя месцы, дзе няма ахвотнікаў спасярод моладзі. Аднак пры гэтым, умова, калі працоўны пэнсіянер атрымлівае толькі частку пэнсіі, ацэньваецца адназначна адмоўна. Пра гэта сьведчаць і вынікі фокус-групаў, і зьвесткі апытаньня: амаль 80% насельнікаў мяркуюць, што працоўны пэнсіянер мусіць атрымліваць і пэнсію і заробак.

### Ураўнілаўка — гэта несправядліва

У Беларусі пэнсійная сыстэма мае ўраўняльны характар, што ёсьць вынікам дзяржаўнай палітыкі. Большасьць удзельнікаў фокус-груп лічаць гэта несправядлівым і адзначае, што «ураўнілаўка» пры налічэньні пэнсіяў стварае ўстаноўку да пасіўных паводзінаў — работнікі не імкнуцца больш адлічваць, маючы ўпэўненасьць, што ўсе, незалежна ад высілкаў і стажу (як працоўнага эквіваленту грашовых адлічэньняў), атрымаюць аднолькавую сярэднюю пэнсію. Па-ранейшаму сярод значнай часткі насельніцтва жывы й стэрэатып наконт сувязі паміж працоўнымі высілкамі і ўзроўнем заробку — яго па-ранейшаму «атрымліваюць», а не зарабляюць.

Адзначым, што істотная розьніца ва ўзроўнях пэнсіяў паміж шэраговымі беларусамі й асобнымі катэгорыямі грамадзянаў выклікае ў насельніцтва нэгатыўную рэакцыю: 68,5% апытаных лічаць адлічэньні дзяржаўным службоўцам неабгрунтавана высокімі. Далей з адставаньнем ідуць супрацоўнікі сілавых структур і вайскоўцы. Практычна не выклікае сумневаў неабходнасьць выплачваць больш высокія пэнсіі асобам, якія працуюць у шкодных умовах.

### Як падвысіць пэнсіі

Павышэньне падаткаў ёсьць адным са спосабаў павелічэньня пэнсійных выплат. Аднак у Беларусі гэтая мера лічыцца надзвычай непапулярнай — такую пэрспэктыву падтрымалі ўсяго 1,8%. Каля паловы беларусаў пасьлядоўна выступаюць супраць павышэньня падаткаў беспасярэдне з грамадзянаў. На думку рэспандэнтаў, рост падаткаў адаб'ецца на спажыўцах. Рэзэрвам для павелічэньня пэнсійнага фонду прадстаўнікам ўсіх ўзроставых груп бачацца сродкі зь дзяржбюджэту, скарачэньне выдаткаў на войска, сілавыя структуры, міліцыю, будаўніцтва спартовых аб'ектаў, будоўлю аграгарадкоў і адміністрацыйны апарат, і барацьба з карупцыяй.



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Канфлікт пакаленьняў

Пра дзяржаўную пэнсію як пра недастатковую, але неабходную крыніцу даходу, гаворыць большыня беларусаў (65,9%). На яе людзі разьлічваюць у любым разе — «*дзяржава ўсё адно яе выплаціць*» — і ня хочуць ад яе адмаўляцца. Адным з асноўных спосабаў забясьпечыць сабе даход ад пэнсіі беларусы лічаць працяг працы ці падпрацоўку пасьля надыходу пэнсійнага ўзросту. Апроч таго, дадатковымі крыніцамі даходу на пэнсіі выступаюць такія традыцыйныя яго формы, як даход з прысядзібнае дзялкі й дапамога дзяцей.

Аднак дзяржаўная пэнсія ня ўсімі ўспрымаецца, як адзіная магчымасьць. Так, у адрозьненьне ад старэйшага пакаленьня, якое часьцей спадзяецца на гэтую даволі мізэрную крыніцу даходу, пакаленьне 18—24-х гадовых мае ўласныя жыцьцёвыя стандарты прыбытку і імкнецца да іншага ладу жыцьця. Нявялікі пакуль адсотак маладых людзей бачыць сваю будучыню ў банкаўскіх апшчаджэньнях. Група людзей, што робяць апшчаджэньні да пэнсіі, пакуль налічвае 12,5%. Да іх адносяцца найперш асобы з вышэйшай адукацыяй, работнікі недзяржаўнага сэктару і прадстаўнікі групы з высокім даходам.

### Жывуць адным днём

Неабходна адзначыць, што ва ўсіх узроставых групах ёсьць стабільны сэгмэнт (да 20%), арыентаваны на бягучае спажываньне. Пэўны ўплыў на прычыны неахвоты рабіць дадатковыя пэнсійныя адлічэньні мае эканамічнае становішча работніка. Тыя, хто мае нізкі даход, ня хочуць адкладаць грошы менавіта з тае прычыны, што ня маюць на гэта сродкаў. Асабліва гэта характэрна для больш маладых груп — тых, у каго даход ніжэйшы, а пэрспэктыва пэнсіі аддаленая. Блізка чвэрткі работнікаў ня хоча рабіць пэнсійных адлічэньняў проста таму, што мяркуюць, што іх будучая пэнсія ня будзе залежаць ад таго, ці рабілі яны выплаты цягам працоўнай дзейнасьці.

### Пэрспэктывы рэформаў

Фармальна наша пэнсійная сыстэма дазваляе рабіць дадатковыя адлічэньні, аднак, згодна з заявамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, з гэтага карыстаецца нязначны адсотак беларусаў. Згодна апытаньня, 40% рэспандэнтаў дэкляруюць такое жаданьне, але большасьць работнікаў па-ранейшаму ня ведаюць і не ўспрымаюць магчымасьцяў беларускай пэнсійнай сыстэмы як рэальных і гарантаваных пэрспэктываў укладаньня сродкаў. Па меры росту кампэтэнтнасьці доля тых, хто гатовы рабіць адлічэньні ў дзяржаўны банк, скарачаецца, а ўзрастае доля прыхільнікаў апшчаджэньня ў прыватных беларускіх банках. Група, якая мае веды і досьвед, частку адлічэньняў пакладзе ў дзяржаўны, а частку — у прыватны пэнсійны фонд.

У залежнасьці ад стаўленьня да рынкавых рэформаў дасьледчыкі падзялілі апытаных на рыначнікаў, патэрналістаў і нявызначаных. Першыя лічаць сытуацыю нестабільнай і гатовыя рабіць пэнсійныя зьберажэньні па-за сыстэмай дзяржаўных інстытуцыяў. Патэрналісты разьлічваюць на дзяржаўную пэнсію і ня робяць крокаў да ўтварэньня дадатковых адлічэньняў. Яны бачаць выйсьце ва ўзмацненьні ролі дзяржавы і зьніжэньні ўзроўню інфляцыі. Нявызначаныя, хоць і хацелі б, каб дзяржава забясьпечвала пэнсіі, але ва ўмовах, калі іх надзеі не рэалізуюцца, дзейнічаюць у рамках цяперашняй сыстэмы, каб забясьпечыць сабе жыцьцё на пэнсіі. У старэйшым веку яны арыентаваныя на дадатковыя апшчаджэньні, і больш за іншых робяць зьберажэньні.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### «Heineken» набывае «Рэчыцапіва»

22 траўня галяндзкая кампанія, якая напрыканцы мінулага году набыла бабруйскую піваварню «Сябар», афіцыйна абвесьціла пра набыцьцё кантрольнага пакету акцыяў ААТ «Рэчыцапіва». Паводле дамовы галяндзкі бок інвэстуе ў павелічэньне акцыянэрнага капіталу рэчыцкага бровару $9,9 млн. Пасьля гэтай угоды «Heineken N.V.» мае заняць да 25% беларускага піўнога рынку.

З 1 чэрвеня піваварня «Сябар» пачынае выпуск квасу гатункаў «Лагодны» і «Спраўны» (брэнд «Хатні»). «Рэчыцапіва» заснаваная ў 1975 г. У 2000 г. ператвораны ў сумеснае беларуска-літоўскае прадпрыемства. Магутнасьці прадпрыемства дасягаюць 5,2 млн. дал у год. Бровар прадае прадукцыі пад гандлёвымі маркамі «Рэчыцкае», «Дняпроўскае», «BergG». Кампанія «Heineken N.V.», заснаваная ў 1864 г., валодае 119 піваварнямі ў 65 краінах. Паводле аб'ёмаў прадукцыі, «Heineken N.V.» займае 3-е месца ў сусьветным рэйтынгу вытворцаў піва і першае — у Эўропе.

### У траўні інфляцыя не перавысіць 1%

Гэта паабяцаў міністар эканомікі Мікалай Зайчанка. За студзень—красавік інфляцыя склала 5,3%.

### Выезд зь Менску на Нарач рэканструююць

Уведзеная ў справу чатырохпалосная дарога 1-й катэгорыі на выезьдзе з сталіцы ў кірунку Навінкі-Паперня (кавалак да скрыжаваньня з дарогай Заслаўе-Калодзішчы). Далей паводле праекту замест сёньняшняй кругавой развязкі пабудуюць новую дзьвюхузроўневую. Верхні ўзровень пойдзе ў абход вёскі Дубаўляны. Цалкам у эксплюатацыю новы ўчастак увойдзе ў кастрычніку-лістападзе 2009 году. Раней на гэтай дарозе трымаліся гіганцкія заторы ў гадзіны пік.

### Турысты абмінаюць Беларусь

За 4 месяцы Беларусь наведала ўсяго 14 тыс. арганізаваных турыстаў. Праўда, гэта аж на 3 тыс. менш, чым летась.Палова зь іх — з Расеі, 1,5 тыс. — з Турцыі, з Італіі — 591, Вялікабрытаніі — 482.

### Зь лета можна набываць Wi-Fi

Паслуга Wi-Fi — бяздротавае далучэньне кампутараў да Сеціва, зь лета пяройдзе з тэставай у камэрцыйную эксплюатацыю, паведамляе Міністэрства сувязі інфарматызацыі. Акрамя Wi-Fi, у чэрвені ў Менску зьявіцца альтэрнатыўная традыцыйнаму тэлебачаньню тэхналёгія IPTV, што дазваляе перадаваць відэа ў рэжыме рэальнага часу. Аднак пакуль не вядомыя ні кошт паслугі, ні яе правайдэры. Разьвіцьцё бяздротавай гарадзкой сеткі (тэхналёгія WiMAX), што мае замяніць кабэльныя альбо DSL-лініі, адкладзенае на наступны год.

### «Газпром» мае намер стаць кампаніяй №1 у сьвеце

Пра гэта заявіў старшыня праўленьня «Газпрому» Аляксей Мілер. На сёньня «Газпром» выйшаў па сваёй капіталізацыі на 3-е месца ў сьвеце. Ён абагнаў General Electric і China Mobile літаральна за апошнія тыдні. Прыход у Крэмль былога старшыні рады дырэктараў «Газпрому» Мядзьведзева рэзка ўзьняў кацыроўкі акцый расейскага газавага манапаліста.

### Цэны на нафту ўсё растуць

Нафтаздабыўныя краіны пацiраюць рукі: цэны на нафту растуць а растуць. У аўторак на нью-ёрскай біржы кошт чэрвеньскіх фьючэрсаў на амэрыканскую лёгкую нафту складаў $129 за барэль. Згодна з прагнозамі, тэндэнцыя да росту цэнаў на нафту захаваецца, і яны могуць перавысіць 150 даляраў за барэль. У сваю чаргу, іх рост ужо выклікаў рост цэнаў на энэргаёмкія тавары, у тым ліку на сельгаспрадукты.

### Скачок цэнаў зямлі ў Польшчы

Цана ворнай зямлі ў Польшчы падскочыла на 28% ад пачатку году і складае цяпер у сярэднім 14 500 злотых (6 700 даляраў) за гектар. Рост выкліканы ростам датацый, што атрымліваюць на ўрабляньне зямлі сяляне ад Эўрасаюзу.

**СП; паводле «Экономическая газета», БелаПАН, БЕЛТА, gazeta.pl**

# Узаконенае забойства

Днямі на сайце nn.by ішла гарачая дыскусія чытачоў вакол тэмы абортаў, выкліканая публікацыяй матэрыялу пра супрацьабортавы пікет 9 мая на рынку ў Докшыцах. Піша **Кастусь Шыталь.**


MENSITE.RU

Хрысьціяне адназначна называюць аборт забойствам. Паводле вучэньня ўсіх хрысьціянскіх канфэсіяў, ужо ў момант зачацьця чалавек атрымлівае ад Бога несьмяротную душу, і таму ён зьяўляецца жывым стварэньнем, якое мае такое ж правы на жыцьцё, як і дарослы чалавек. Паводле хрысьціянскага вучэньня, толькі Бог можа забраць у чалавека жыцьцё, дадзенае Ім. Для хрысьціян больш доказаў на карысьць забароны абортаў непатрэбна. А як зь нехрысьціянскага пункту гледжаньня?

Пра тое, што пры злучэньні мужчынскага спэрматазоіда з жаночай яйкаклеткай адбываецца зараджэньне новага жывога арганізму, ведае кожны яшчэ з школьных падручнікаў па біялёгіі. Гэты новы арганізм пераймае частку генэтычнага коду ад бацькі, частку ад маці. Аднак ён зьяўляецца новай, самастойнай істотай, а ня часткай мацярынскага арганізму, бо нясе ў сабе іншы генэтычны код.

Сучасныя навуковыя дасьледаваньні дазваляюць вельмі дакладна назіраць за развіцьцём дзіцяці да нараджэньня. Сэрца дзіцяці пачынае біцца ўжо на 18-ты дзень пасьля зачацьця. У пяць з паловай тыдняў дзіця ўжо рухае галоўкай, а яшчэ праз тыдзень можа рухаць усім целам. У 10 тыдняў яно ўжо мае адбіткі пальцаў. Назваць эмбрыён часткай цела цяжарнай жанчыны нельга, бо ён мае іншы генэтычны код, а ў палове выпадкаў — іншы пол. То бок чалавечы эмбрыён — гэта ўжо новы чалавек, які праходзіць утварэньне перад тым, як пачаць жыцьцё па-за ўлоньнем маці. Так, да нараджэньня чалавек ня цалкам развіты. Але, калі кіравацца такой лёгікай, то і нованароджаных дзяцей ня трэба лічыць за дзяцей, бо яны без дапамогі не пражывуць і дня.

...У матку жанчыны ўводзіцца трубка, падключаная да вакуўмнай помпы. За некалькі хвілінаў з-за розьніцы ціску дзіцё, цалкам або разарванае на часткі, высмоктваецца з улоньня жанчыны... Альбо цела дзіцяці разразаюць на часткі адмысловым нажом-кюрэткай, пасьля чаго парэшткі дастаюць вонкі. Яшчэ больш жорстка выглядае аборт на другім трымэстры цяжарнасьці. Урач пры дапамозе шчыпцоў захоплівае частку цела дзіцяці, адрывае яе, пасьля бярэцца за іншую. Галава ўжо досыць вялікая, таму, каб яе дастаць, даводзіцца расьціснуць яе шчыпцамі, каб пацяклі мазгі. Дзіцё пры гэтым адчувае дзікі боль. Яшчэ больш страшнай формай аборту зьяўляецца ўвядзеньне канцэнтраванага раствору солі ў плацэнту, у выніку чаго на працягу некалькіх гадзінаў дзіцё памірае ў страшных пакутах. Калі пасьля ў выніку спазмаў маткі альбо звычайнага аборту дастаюць мёртвае ўжо цела дзіцяці, то бачна, што скура і ўсе яго сьлізніцы маюць хімічны апёк.

Яно — жывое, яно — дзіцё, яно — чалавек. Таму цалкам лягічна

> Пазбаўляць чалавека права на жыцьцё, матывуючы гэта дабром самога чалавека, — абсурдна.

і справядліва лічыць аборт забойствам дзіцяці. З дапамогай ультрагукавых дасьледаваньняў можна ўбачыць, што дзіцё спрабуе адсунуцца ад абартыўных інструмэнтаў, у адчаі матляе нагамі і рукамі, пульс падвышаецца да 200 удараў за хвіліну. Калі гэтыя інструмэнты захопліваюць частку яго цела, рот дзіцяці раскрываецца, нібы ў крыку. «Немы крык» — так быў названы адзін зь першых дакумэнтальных фільмаў, прысьвечаных праблеме абортаў. Цяпер у інтэрнэце шмат такіх відэазапісаў, якія дадуць фору многім галівудзкім жахалкам.

Ці можна чым-небудзь апраўдаць забойства дзіцяці? Пытаньне дзіўнае, але прыхільнікі абортаў прыводзяць шмат аргумэнтаў — «свабодны выбар жанчыны», небясьпека павелічэньня колькасьці крымінальных абортаў, матэрыяльныя цяжкасьці. Але хіба ўсе гэтыя прычыны могуць быць важнейшымі за жыцьцё чалавека? Калі жанчына мае права забіць дзіця, то тады, паводле лёгікі, трэба было б легалізаваць забойствы ўвогуле. Жанчыне перашкодзіць «незапляанаванае дзіцё», а мяне, напрыклад, раздражняе сусед-алькаголік.

«Ну, забойства дык забойства, часам бываюць такія жыцьцёвыя сытуацыі», — кажуць некаторыя. Да чаго ж мы тады дайшлі, калі выказваем такія погляды? Забіць чалавека — выйсьце зь нейкай сытуацыі? Калі ж мы, з усьведамленьнем, што ненароджанае дзіця зьяўляецца дзіцём, апраўдаем яго забойства, то чым мы лепшыя за нацыстаў, якія мэтаскіравана зьнішчалі габрэяў, ці саветаў, якія выбішчалі «ворагаў народу»? Злачынствы камунізму і фашызму таксама рабіліся «ў імя лепшай будучыні».

Іншыя апраўдваюць аборт дабром самога дзіцяці — «яго ж ня будзе як пракарміць, ня будзе ў што апрануць». Аднак агульнавядома, што людзі ў любой цяжкасьці трымаюцца за жыцьцё і стараюцца выжыць. Пазбаўляць чалавека права на жыцьцё, матывуючы гэта дабром самога чалавека, — абсурдна.

Вось якімі думкамі захацелася мне падзяліцца па прачытаньні дыскусіі на nn.by.

*Докшыцы*

# І ўсё нам ня так

Калі я ішоў у школку ў сем год, я ведаў толькі пару літараў. Цяпер ад шасьцігодак патрабуюць, каб яны ўжо чыталі, лічылі, разьбіралі словы па складох і адрозьнівалі зычныя і галосныя. Піша **Руслан Равяка.**

Сёлета мая дачка пойдзе ў школу. На сёньня ніводны з бацькоў дзяцей, якія першы раз трапяць у школу, ня ведае, як будуць вучыцца дзеці і колькі год. Ня ведаюць пра гэта цяперака, відаць, і ўрадоўцы. Пасьля знакамітага выступу Лукашэнкі разгубіўся шмат хто.

Імклівасьць школьных рэформаў спазнала кожнае пакаленьне беларусаў з канца 1980-х. Я сам ніколі не вучыўся ў восьмай клясе, бо пераскочыў зь сёмай адразу ў дзявятую — тады ўводзілася адзінаццацігодка. Не пасьпелі прызвычаіцца да адзінаццаці гадоў, як давялося прывыкаць да дзесяцібалавай сыстэмы і дванаццацігодкі. Цяперака, відаць, усё завернуць назад.

Падчас гутаркі мой знаёмы прыгадаў, што за савецкім часам таксама былі ўвялі адзінаццацігодку, але праз пару гадоў скасавалі. І ён трапіў у першую клясу, якой выпадала вучыцца ізноў дзесяць год. Па-першае, неставала падручнікаў, па-другое, у адзін зь ім год выпускаліся і апошнія «адзінаццацігодкі». Зразумела, што і тыя, і тыя памкнуліся паступаць. Конкурс нават у ПТВ быў шалёны. «Добра, — сьмяецца знаёмы, — тых старых амаль адразу ў войска пабралі…»

У народзе даўно ўжо зганілі дванаццацігодку. За расьцягнутасьць, размытасьць і ў той самы час перанасычанасьць навучаньня. За шматлікія рэфэраты і кантрольныя. «Раней мы зь дзесяцігодкі ў інстытут самі паступалі, — скардзілася мне адна знаёмая, — а цяперака па 12 год вучацца, і рэпэтытара трэба наймаць, ды тая самая школьная выкладчыца і прапануе дачку падцягнуць да ВНУ. А чаго яна тады іх на ўроках ня вучыць?» Яшчэ сто год таму большасьць беларусаў мела магчымасьць атрымаць толькі пачатковую адукацыю. Зрэшты, тая большасьць лічыла, што чытаць, лічыць ды крыху пісаць дастаткова для існаваньня на гэтай зямельцы.

Падаецца, што нічога не зьмянілася й дасюль. Народ ганіць школьныя рэформы, новаўвядзеньні, але пхае дзяцей у карак па вышэйшую адукацыю. Бо заканчэньне інстытуту падаецца шараговому беларусу тым ключом, які адчыніць дзьверы да лёгкага жыцьця за шыкоўным сталом у

> Народ ганіць школьныя рэформы, новаўвядзеньні, але пхае дзяцей у карак па вышэйшую адукацыю.

скураным крэсьле. Пазбавіць працы на палетках, ля станкоў і бруду.

Некалькі месяцаў таму ў дзіцячым садку павесілі сьпіс, што мусіць умець рабіць дзіцё, каб ісьці ў школу. Акрамя таго, што свабодна чытаць і лічыць, ведаць вялікія гарады Беларусі й сусьвету, нашы краіны-суседкі, дык яшчэ разьбіраць словы па складох, адрозьніваць зычныя і галосныя… Прачытаўшы сьпіс да канца, я шчыра парадаваўся, што не знайшоў тамака веданьня інтэгралаў і лягарыфмаў, спалучэньняў галосных на сутыках частак складаных словаў і пад. Прыпомніў, што сам я пайшоў у школку толькі ў сем год, ведаючы колькі літар. Астатняга мяне вучылі ў школе.

На гэтым тыдні мая дачка паведаміла, што я мушу яе завесьці ў бібліятэку. Як высьветлілася, іх усёй групай вадзілі ў дзіцячую бібліятэку на экскурсію. Дзеля прылікі мы пайшлі туды. Тамака я быў зьбянтэжаны і ашаломлены — уся выпускная група дзіцячага садку была запісаная ўжо чытачамі бібліятэкі й мела абанэмэнты!.. Парадавала толькі прысутнасьць беларускамоўнай дзіцячай літаратуры. Зрэшты, і я шакаваў бібліятэкарку, бо стаўся першым з бацькоў, хто адказаў на яе пытаньне, што такое «пацеркі»…

*Баранавічы*

# Гульня ў вайну

У той момант, калі стала ясна, што Дзіма Білан зойме першае месца на конкурсе Эўравізіі, камэнтатар каналу «Расея», яшчэ не прыйшоўшы ў прытомнасьць ад захапленьня, раптам узгадаў Гватэмалу. Піша **Віталь Тарас**.

Менавіта адтуль, з аднайменнай сталіцы лацінаамэрыканскай рэспублікі, дзе МАК абраў Сочы месцам Зімовай Алімпіяды 2014 году, на думку вядоўцы, пачаліся ўсе расейскія перамогі апошняга часу. Ня толькі ў галіне лядовых відаў спорту (найперш — у фігурным катаньні), але ж і ў поп-музыцы расейцы цяпер найлепшыя калі ня ў сьвеце, дык у Эўропе.

## Ад Масквы да Эквадору

У захапленьні перамогамі сваіх спартоўцаў альбо поп-выканаўцаў, вядома, няма нічога кепскага. Можна ўспомніць, як адносна нядаўна ўся Украіна радавалася за Руслану, як Славаччына тыдзень сьвяткавала першую перамогу сваёй зборнай на чэмпіянаце сьвету па хакеі, як беларусы радаваліся за хакейную зборную РБ, калі яна аднойчы перамагла швэдаў ці калі Ксэнія Сітнік атрымала першы прыз на дзіцячай Эўравізіі.

Але ж цяжка, відаць, знайсьці іншыя прыклады, калі перамога айчынных артыстаў або спартоўцаў выклікае ў камэнтатараў параўнаньні сапраўды сусьветнага маштабу. Зразумела, не ў камэнтатарах справа. Футбольныя заўзятары, напэўна, добра памятаюць лёзунг прыхільнікаў маскоўскага «Спартака»: «От Москвы до Эквадора лучше нет, чем Ярцев Жора!»

У Савецкім Саюзе перамога ў любых міжнародных спаборніцтвах — у хакеі, баскетболе, шахматах, няважна — кожны раз была справай гонару, доблесьці й геройства. А самае галоўнае, кожная перамога рабілася доказам перавагі сацыялізму над капіталізмам.

Пройгрыш пры гэтым не лічыўся доказам адваротнага — прычына яго заўсёды палягала ў варожых дывэрсіях і пакдопах, разьвязанай пэўнымі коламі на Захадзе кампаніі. Тое самае мы назіраем сёньня і ў паводзінах расейскіх (ды хіба толькі расейскіх?) «камэнтатараў». Толькі «веліч ідэяў ленінізму» замяніла цяпер веліч Расеі, «якая ўздымаецца з каленяў».

## Хлопцы з нашага двара

Слова «бандэравец» памятаю зь дзяцінства — як сымбаль чагосьці незразумелага і ад таго яшчэ больш страшнага.

Аднойчы «на бульбе», куды ўпершыню патрапіў на першым курсе, пачуў параду старэйшага студэнта, як трэба знаёміцца зь дзяўчатамі. Спытайцеся, напрыклад, як прайсьці да помніка Калчаку — і вось яна ўжо ўсьміхаецца вам у адказ на жарт. І вы можаце завязваць зь ёй кантакт... Пра помнік Сьцяпану Бандэру тады казаць нікому не прыходзіла да галавы, нават жартам. Даўно ёсьць помнік Калчаку ў Расеі. І помнік Бандэру таксама — стаіць у Львове, на аднайменнай плошчы. Але пра Бандэру гаворка ніжэй.

У сваім менскім дзяцінстве я неяк незаўважна для сябе засвоіў прынцып — хварэць за слабога. У нашым двары на вуліцы Якуба Коласа (дагэтуль не разумею, чаму імя паэта далі самай шумнай, самай загазаванай на той час вуліцы сталіцы), гуляючы ў «вайнушку», многія, калі ня большасьць з нас, выбіралі для сябе ролю «немцаў», а не «савецкіх». Гуляць у «савецкіх» неяк ня вельмі хацелася. Кожны дзень паказвалі па тэлевізіі, як савецкая армія перамагла нямецкіх захопнікаў, разграміла фашызм. Ясная справа, усе немцы ў фільмах былі кепскія, а «нашы», адпаведна, спрэс харошыя. І перамагалі харошыя кепскіх зь лёгкасьцю надзвычайнай. Але ж гуляць у станоўчых герояў нецікава. Іншая справа — прыкінуцца ворагам, эсэсаўцам, паліцаем. І задаць перцу гэтым «савецкім»: страляць з драўлянага «шмайсэра», крычаць ім «хэндэ хох!», «капут» і «швайнэ». Вось гэта дадавала адрэналіну. Псыхолягі патлумачаць, напэўна, тыя гульні патрэбай даць выхад дзіцячай агрэсіі ці яшчэ якім псыхааналізам. Але мне падаецца, што для дзяцей 60-х гадоў гэта быў, акрамя ўсяго, «бунт» супраць дарослага сьвету зь ягонымі правіламі, поўнымі фальшу, а галоўнае — шчырасьці афіцыйнай прапаганды.

Канечне, траляліся сярод менскіх падлеткаў і садысты, якім прыносіла асалоду зьдзекавацца менавіта з малых. Былі, канечне, і тыя, хто бегаў за бамбізамі ўсьлед, усяляк стараючыся ім спадабацца, гатовыя зь яшчэ большай вытанчанасьцю зьдзекавацца са слабых. Але ў нашым двары жылі хлопцы (старэйшыя за нас зусім не нашмат, як я цяпер разумею) адважныя і моцныя, заўсёды гатовыя даць адпор «ворагу», безкарысьліва абараніць «малых сіх». Таму сярод нас ніхто за чужыя сьпіны не хаваўся, і — што, можа быць, кепска — не баяўся счапіцца са спаборнікам нашмат больш дарослым і мацнейшым. Што завяршалася, зразумела, разьбітымі насамі ды бацькоўскімі наракан ьнямі.

## «Малітва пра Бандэру»

Гэтыя дзіцячыя ўражаньні прыходзяць на ўспамін, калі бачу, як дарослыя людзі — салідныя палітыкі, журналісты, палітолягі пачынаюць разважаць пра іншыя народы, іх гісторыю, іх далейшы лёс, пагдядаючы зьверху ўніз і карыстаючыся, як ім падаецца, правам старэйшага брата, мацнейшага й мудрэйшага за ўсіх астатніх.

Прадбачу тут закіды адразу з двух бакоў. Тыя, для каго Беларусь усяго толькі правінцыя, хто ня можа ўявіць яе існаваньня без Расеі, аўтара гэтых радкоў, абвінавацяць, напэўна, у русафобіі ды паклёпе на расейскі народ. З глеdзішча іншых, мабыць, аўтар занадта часта піша пра Расею і расейскіх палітыкаў, часам злаўжывае цытатамі з сучасных расейскіх аўтараў і расейскіх клясыкаў. Але ж рабіць выгляд, быццам мы жывем у нейкім, цалкам адасобленым ад Расеі і расейскай палітыкі, цудоўным беларускім сьвеце — значыць, замыкаць сябе ў тым самым культурным гета, зь якога мы, нібыта, імкнёмся вырвацца. Гэта нагадвае мне рэакцыю дзіцяці, якое стаіць пасярод шашы і, заўважыўшы фары «ціру», што набліжаецца з шалёнай хуткасьцю, заплюшчвае вочы, каб нічога ня бачыць.

Прызнаюся, што гэты артыкул напісаны пад уражаньнем эсэ, прачытанага на расейскім сайце grani.ру. Маю на ўвазе эсэ «Малітва пра Бандэру» айца Якава Кротава. Адразу зазначу, што не лічу меркаваньне яго аўтара адзіна слушным, бо такіх меркаваньняў увогуле не бывае. У сваіх публіцыстычных тэкстах айцец Якаў бывае досыць супярэчлівым і непасьлядоўным. Напрыклад, у сваёй рэцэнзіі на «Катынь» Анджэя Вайды ён выказаў думку, што фільм польскага творцы «належыць не да традыцыі гуманізму, але да традыцыі дзяржаўніцкай, нацыянальнай, патрыятычнай», што рэжысэр, нібыта, пазьбягае пытаньня пра Бога і чалавека, пра дапушчальнасьць зла і гвалту. Для тых, хто мог пабачыць гэты фільм, ацэнка гэтая выглядае, мякка кажучы, спрэчнай. Дарэчы, і сваім новым эсэ айцец Якаў уже не праціластавіў памятак веры і памятак патрыятызму.

## Вялікія ўкраінцы

Падставай для напісаньня эсэ сталася паведамленьне ў расейскіх СМІ пра тое, што архіяпіскап Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Ігар адслужыў паніхіду па «бандэраўцах» і іншых байцах Украінскай паўстанцкай арміі.

Паведамленьне, вытрыманае ў найлепшых традыцыях крамлёўскай прапаганды, павінна выклікаць нянавісьць да ўкраінскіх нацыяналістаў. Факт, што архіепіскап Ігар адслужыў у той самы дзень малебен і па байцах Савецкай арміі, Арміі Краёвай і ўсіх ахвярах другой сусьветнай вайны, абыдзены ўвагай. Як і тое, што разам з архіепіскапам маліўся сьвятар каталіцкай царквы.

Дарэчы, нядаўна ва Ўкраіне адбыўся конкурс «Вялікія Ўкраінцы», вынікі якога на адным з украінскіх тэлеканалаў прадставіў небезьвядомы Савік Шустэр. Паводле вынікаў конкурсу першае месца ў сьпісе заняў Яраслаў Мудры, другое — акадэмік Амосаў і трэцяе — Бандэра. Некаторыя мэдыі абвінавацілі арганізатараў у падтасоўцы. Паводле некаторых падлікаў, Бандэра заняў, насамрэч, першае месца, а трэцяе — Тарас Шаўчэнка. Арганізатары, нібыта, збаяліся рэакцыі Расеі, дзе ўжо рыхтаваліся назваць конкурс «правакацыяй украінскіх нацыяналістаў». Так гэта ці не, але ж вядома, што правакацыйныя заклікі мэра Масквы вярнуць Севастопаль Расеі былі са спачуваньнем усрыняты расейскім МЗС, а рашэньне ўкраінскіх уладаў абвясьціць Лужкова пэрсонай нон грата, наадварот — як варожы выпад.

Айцец Якаў Кротаў у сваім эсэ знайшоў, як мне падалося, удалую лякантчную формулу, якая раскрывае сутнасьць справы: «Тыя расейцы, якія крыўдуюць на жаданьне ўкраінцаў жыць асобнай дзяржавай, пагодзяцца на ўваходжаньне Расеі ў склад Украіны? Пры захаваньні мовы і культуры, але са сталіцай у Кіеве?» Калі не — адказвае на рытарычнае пытаньне аўтар — значыць, «крыўда выклікана не імкненьнем жыць разам, безь мяжы і мытні, а імкненьнем ўладарыць і распараджацца».

Якаў Кротаў задаецца далей іншым пытаньнем: «Тыя расейцы, якія асуджаюць украінцаў, што пайшлі на кампраміс з нацызмам дзеля дасягненьня ў будучым незалежнасьці Ўкраіны, асуджаюць камуністычных праваднікоў за кампраміс з нацызмам у 1939 годзе, за дамову з Гітлерам, пасьля якой сьвет атрымаў другую ўсясьветную вайну, а СССР атрымаў усходнія землі тагачаснай Польшчы, Літву, Латвію, Эстонію?»

## ...Шчэпкі ляцяць

Адказ на гэтае пытаньне відавочны. «Калі забіў «бандэравец» — гэта страшны грэх, калі забіў «чэкіст» — гэта «шчэпкі ляцяць»», піша Якаў Кротаў. Ён нагадвае, што за забойства Бандэры ў пасьляваенны час супрацоўніка КГБ публічна ўзнагародзілі ордэнам. Нагадвае і пра тое, што сярод замагароў за незалежнасьць Украіны былі прыхільнікі часовага саюзу з гітлерцамі, але Бандэра быў супраць, праз што разышоўся зь іншымі кіраўнікамі незалежніцкага руху. Больш за тое, праз некалькі дзён пасьля таго, як 30 чэрвеня 1941 году ў Львове было абвешчана стварэньне Ўкраінскай дзяржавы, Бандэра быў арыштаваны на загад Гітлера. Ягоныя браты загінулі ў нямецкім канцлягеры, сёстры — сасланыя ў Сібір, а многія паплечнікі — закатаваныя гестапа і НКВД.

Акрамя таго, што бандэраўцы змагаліся на два франты — з гітлерскімі захопнікамі і савецкім войскам, яны, адрозна ад іншых украінскіх узброеных фармаваньняў, не чынілі пагромаў. У дакумэнтах УПА адразу было запісана: «яўрэяў ня б'ем». Яўрэі былі ў яе шэрагах. Так што абвінавачаньні бандэраўцаў у антысэмітызьме, мякка кажучы, перабольшаныя савецкай прапагандай. Крута замяшанай, дарэчы, на антысэмітызьме.

Яшчэ большая мана — заявы пра тое, што бандэраўцы не карысталіся падтрымкай у народзе. Каб пазбавіць паўстанцаў падтрымкі, НКВД даволся расстраляць у Заходняй Украіне 130 тысяч чалавек і 300 тысяч дэпартаваць у Сібір.

Аб тым, як змагаліся байцы НКВД з бандэраўцамі, сьведчыць эпізод, які здарыўся ў кастрычніку 1944 году. У вёсцы Крывенька на Тэрнопальшчыне сяляне забілі трох чэкістаў зь пятнаццаці, калі тыя прыехалі высяляць сем'і паўстанцаў. Наступным днём прыехалі ўжо 60 чэкістаў. Далей Якаў Кротаў цытуе архіўны дакумент: «Банды ў сяле ня выявілі. Знаходзячыся ў нецьвярозым стане, маёр Палянскі, мал. лейтэнант Малдаванаў расстралялі ні ў чым не вінаватых грамадзянаў ва ўзросьце ад 60 да 80 гадоў у колькасьці 10 чал. і спалілі 45 дамоў». У 1946 годзе, як вынікае са справаздачы міністраў унутраных спраў і дзяржбясьпекі, былі забітыя 110 тысяч «бандытаў». Ніхто за тыя «подзьвігі» асуджаны ніколі ня быў. Наадварот, шмат хто з герояў НКВД атрымаў узнагароды.

## Катынь ад слова «кат»

Гісторыя другой сусьветнай вайны, выглядае, пакуль яшчэ не напісаная. Нельга яе вывучыць, а тым больш — зразумець на падставе савецкай гістарыяграфіі. Напрыклад, на падставе афіцыйнай гісторыі партызанскага руху ў Беларусі альбо ва Ўкраіне. Праўдзівая гісторыя вайны ня можа быць напісаная, пакуль усе факты, у тым ліку і тыя, што тычацца беларускай калябарацыі, дзейнасьці НКВД, Сьмершу, Арміі Краёвай, падпольля, карных акцыяў супраць мірнага насельніцтва як з боку нямецкіх войскаў і паліцэйскіх падразьдзяленьняў, гэтак і партызанскіх атрадаў, ня стануць прадметам абмеркаваньня, грамадзкай дыскусіі. Шчырай, адкрытай, пазбаўленай ідэалягічных шораў, перадузятасьці й жаданьня помсты. А галоўнае — ачышчанай ад палітыкі, ад расейскай інтэрпрэтацыі гісторыі, якая дагэтуль дамінуе ў школьных падручніках у Беларусі. І гэта тычыцца ня толькі гісторыі.

Вось апошняе, зусім нядаўняе паведамленьне. Яно таксама прыйшло з Расеі. Тамтэйшая пракуратура адмовілася прадастаўць Хамоўніцкаму суду ў Маскве матэрыялы справы па Катыні. Крэўныя польскіх афіцэраў, расстраляных у Катынскім лесе, патрабуюць кампэнсацыі ў 22 мільярда даляраў — прыблізна 1 мільёне даляраў за кожнага забітага. Як нагадвае ў гэтай сувязі «Независимая газета», у верасьні 1939 году савецкімі войскамі на тэрыторыі Польшчы былі захопленыя 240 тысячаў палонных. «У красавіку-траўні 1940 году амаль 22 тысячы палякаў, б е л а р у с а ў (вылучана мной — **В.Т.**), украінцаў і яўрэяў — польскіх грамадзянаў, якіх утрымлівалі ў розных лягерах і турмах, былі расстраляныя. Катынь, адно зь месцаў масавых расстрэлаў, стала імем назоўным для абазначэньня ўсіх загіблых». Журналісты расейскай газеты, трэба аддаць ім належнае, не баяцца называць гэтыя факты.

Беларускае грамадзтва ў цэлым дагэтуль баіцца прызнаць нацыянальнай трагедыяй ня толькі Катынь, але й Курапаты, хоць з моманту выхаду артыкула Зянона Пазьняка. Яно, як той хлопчык, стаіць на шашы, заплюшчыўшы вочы і не жадаючы бачыць агромністы грузавік, што імкліва набліжаецца зь мінулага.

# Пятля на волі

Апошнія прысуды ў «справе чатырнаццаці»: **Міхаіл Субач** і **Павал Вінаградаў** атрымалі па два гады абмежаваньня волі без накіраваньня на «хімію», непаўналетні **Максім Дашук** «прывязаны да кватэры» на паўтара году.

Крымінальная справа, узбуджаная пасьля вулічных акцыяў пратэсту прадпрымальнікаў 10 студзеня, фактычна скончылася толькі ў апошнія дні вясны. Дый пра скачэньне можна гаварыць толькі ўмоўна, бо чатырнаццаты абвінавачаны у «грубым парушэньні грамадзкага парадку» студэнт-каліновец Аляксандар Баразенка прыняў рашэньне не вяртацца з Польшчы. Яго абвясьцілі ў крымінальны вышук, але справу, натуральна, не спынілі.

Нагадаем, 22 красавіка судзьдзя Алена Ільіна прыняла рашэньне адправіць Андрэя Кіма на паўтара году ў калёнію, Алеся Чарнышова, Міхаіла Пашкевіча, Алеся Стральцова, Міхаіла Крывава, Тацяну Цішкевіч, Аляксея Бондара і Арцёма Дубскага пакарала двума гадамі абмежаваньня волі без накіраваньня ў спэцкамэндатуры, а Ўладзімер Сяргееў і Антон Койпіш сплацяць штрафы памерам тры з паловай мільёны рублёў. Цяпер гэтыя маладзёны зь «першай партыі» асуджаных чакаюць разгляду сваёй скаргі ў Менскім гарадзкім судзе, які адбудзецца ў чэрвені.

«Другая партыя» — Міхаіл Субач, Павал Вінаградаў і Максім Дашук — не пасьпелі своечасова азнаёміцца з матэрыяламі сьледзтва, таму іх справу было вырашана перакваліфікаваць у асобную. Працэс быў прызначаны на пятніцу 24 траўня, але суд у той дзень не пачаўся. Зь неафіцыйных крыніц стала вядома, што ў суд папросту не зьявіліся сьведкі абвінавачваньня.

Разглядаць справу быў прызначаны судзьдзя Валеры Есьман, а не Алена Ільіна, якая выносіла папярэднія прысуды. Ведаючы манеру працы Есьмана, можна было спрагназаваць, што працэс не зацягнецца. Максымум — некалькі дзён. У красавіку 2006 году, адразу па прэзыдэнцкай кампаніі, ён у той жа экспрэс-манеры асудзіў на два гады «хіміі» за графіці барысаўскіх «зуброў» Алеся Казакова і Зьмітра Зубро.

Варта адзначыць, што за апошні месяц згубілася грамадзкая цікавасьць да працэсу. На суд прыйшло некалькі дзясяткаў чалавек, але заля не была забітая пад завязку. Нават спэцназ выглядаў расслаблена. Пры ўваходзе дзяжурылі некалькі байцоў, якія асабліва не заганяліся на тым, каб лішні раз праверыць ці не праняне хто ў залю нешта «забароненае». З палітыкаў на судзе былі Вячаслаў Сіўчык і Ігар Рынкевіч. На прысуд яшчэ падцягнуўся Мікола Статкевіч. Нават эўрапейскія дыпляматы зьявіліся на працэсе толькі раніцай у першы дзень.

Адзінай акцыяй салідарнасьці з абвінавачанымі стала вывешаная расьцяжка «Не — рэпрэсіям» на адным з суседніх дамоў. Аднак ужо празь дзесяць хвілін яе зьнялі.

Усе тры хлопцы адразу адмовіліся даваць паказаньні. Павал Вінаградаў нават заявіў аб сваім недаверы суду, але яго хадайніцтва не задаволілі.

Сьведкаў з боку міліцыі таксама было ня так шмат, як на першым судзе. Не дапускалі яны і значных ляпаў. Радзевіч, Навумаў, Гаркун, Субач (ён не сваяк абвінавачанаму) шчыра прызналіся, што імі не было зафіксавана грубых парушэньняў грамадзкага парадку з боку Субача, Вінаградава і Дашука.

Запомніўся зноў толькі намесьнік начальніка менскага ДАІ Максім Падбярозкін. Той самы, які на мінулым працэсе заяўляў, што дэманстранты былі п'янымі, а Тацяна Цішкевіч зьбівала міліцыянтаў. Завёў старую катрынку Падбярозкін і цяпер, зь першага погляду «пазнаўшы» ў твар Дашука і Субача. Падбярозкін паведаміў, што менавіта гэтыя маладыя людзі былі аднымі зь першых, хто выйшаў на праезную частку. Таксама успомніў даішнік і тое, што ягоным калегам наносіліся шматлікія ўдары па нагах. Словы Падбярозкіна зноў выклікалі дружны сьмех у залі.

Прадстаўнікі ГУМу, крамы «Ласунак» і прыватных перавозчыкаў ня мелі да абвінавачаных ніякіх прэтэнзій.

Пасьля допыту сьведкаў пачаўся шматгадзінны марафон з праглядам відэаматэрыялаў справы. Варта адзначыць, што відэа не было ідэнтычным таму, што дэманстравалася месяц назад. Зьявіліся абсалютна новыя кадры. Скажам, выступу Анатоля Шумчанкі перад Домам ураду. Відэа зноў было змантажаванае невядомым рэжысэрам, а не суцэльнае. Той самы Вінаградаў зьявіўся ў кадры ўсяго некалькі разоў. Але ні з чаго нельга было зрабіць выснову, што хлопец зьдзяйсьняў нейкія процiпраўныя дзеяньні.

Пракурор Лук'янаў падчас судовых спрэчак прадказальна запрасіў усім абвінавачаным па два гады абмежаваньня волі, але без накіраваньня на «хімію».

Падчас выступаў адвакатаў і апошніх словаў абвінавачаных таксама не было такога карнавалу з жарсьцяў і іроніі, у які ператварыла моладзь папярэднiя судовае разьбіральніцтва. Хіба што адвакаты паказвалі на яўныя памылкі сьледзтва, а пракурор спрабаваў неяк апраўдацца. Нібыта пэрсанажы памяняліся ролямі.

Міхаіл Субач сказаў, што праз тры месяцы пасьля атрыманьня вышэйшай адукацыі, ён зарэгістраваўся індывідуальным прадпрымальнікам. Адпрацаваў ІП 2006 і 2007 гады. Пасьля прыняцьця ўказу №760 Субач быў вымушаны згарнуць справу. Менавіта з гэтай прычыны ён і аказаўся 10 студзеня на Кастрычніцкай плошчы Менску. «Я законапаслухмяны грамадзянін. Пра мае мірныя намеры сьведчыць хоць бы тое, што на акцыю я прыйшоў разам з жонкай і маці, якая таксама працуе прадпрымальніцай», — сказаў М.Субач.

Павал Вінаградаў таксама спрабаваў пераканаць суд, што акцыя мела негвалтоўны характар, што прыняцце ўказу №760 непасрэдна адбілася і на ім. Максім Дашук застаўся верным сабе, адмовіўшыся нават ад апошняга слова.

27 траўня а 17-й В.Есьман зачытаў выніковую частку прысуду. Судзьдзя амаль цалкам задаволіў патрабаваньні пракурора. Адзінае, для Дашука ён скінуў тэрмін пакараньня з двух гадоў да паўтара. Толькі пачуўся адзінокі голас Ігара Рынкевіча «Ганьба!».

Прысуд ня выклікаў у абвінавачаных ні відавочнага абурэньня, ні радасьці ад таго, што застаюцца на свабодзе, хаця і ўмоўнай. Павал Вінградаў сказаў, што спадзяваўся на мякчэйшы прысуд, кшталту штрафу: «Цяпер прыйдзецца абмяжоўваць сябе ў актыўнай палітычнай дзейнасьці». Такой самай думкі трымаецца і Максім Дашук: «Адзіным непрыемным момантам у прысудзе ёсьць дамоклаў меч пакараньня ў любы момант».

Маладзёны зьбіраюцца абскардзіць рашэньне суду. Павал Вінградаў мяркуе, што «толку ад гэтага будзе мала, але падаваць варта ў любым выпадку».

Мікола Статкевіч кажа: «На мінулым працэсе частка падсудных атрымала штраф, а частка — «хімію» без накіраваньня ў камэндатуры. І мы іх не залічылі ў палітвязні. Калі мы ня будзем рэагаваць на такія прысуды, дзе чалавек прывязваецца да сваёй кватэры, то такая форма пакараньня будзе пашырацца».

**Зьміцер Панкавец**



ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

**Міхаіл Субач (зьлева), Павал Вінаградаў і Максім Дашук слухаюць паказаньні М.Падбярозкіна.**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 20 траўня

**Слонім**

Слонімскі стаматоляг **Натальля Кіман** хоча спагнаць з карэспандэнта недзяржаўнай «Газеты Слонімскай» **Сяргея Васільева** грошы за артыкул «Вырваны зуб амаль ня стаў прычынай сьмерці», апублікаваны ў сакавіцкім нумары выданьня. У артыкуле С.Васільеў распавёў гісторыю хваробы жыхаркі Слоніму, якая, паводле публікацыі, ледзьве не памерла пасьля таго, як лекар Н.Кіман выдаліла ёй зуб. Праз памылку стаматоляга жанчына перанесла некалькі апэрацый у абласным шпіталі. Пацярпелая неаднаразова зьвярталася ў суд, пісала скаргі. У студзені 2008 г. суд прызнаў лекарку вінаватай і вынес рашэньне спагнаць 700 тыс.руб. у якасьці кампэнсацыі на карысьць пацыенткі. Сп.Васільеў не выключае, што зварот Н.Кіман у суд — працяг ціску ўладаў на «Газету Слонімскую» — апошняе недадушанае недзяржаўнае выданьне Гарадзенскай вобласьці.

**Менск**

З рашэньня судзьдзі Савецкага раёну **Марыны Фёдаравай** вынікае, што арганізатары акцыі «Эўрапейскі марш» мусяць выплаціць штрафы, уключна зь дзяржаўным мытам, памерам 4,5 млн руб.

Судзьдзя Фёдарава разгледзела пяць пазоваў да апазыцыйных лідэраў ад ЖРЭА Цэнтральнага, Першамайскага, Партызанскага, Савецкага і Ленінскага раёнаў Менску. Паводле пазоваў, у выніку зьмены арганізатарамі маршруту акцыі, што адбылася летась 14 кастрычніка, жылым дамам і прылеглым тэрыторыям была ўчыненая матэрыяльная шкода.

23 красавіка судзьдзя Савецкага раёну **Сяргей Баразна** задаволіў пазоў «Гаррамаўтадору» Менгарвыканкаму да заяўнікаў «Эўрапейскага маршу». Суд пастанавіў спагнаць зь Віктара Івашкевіча, Вінцука Вячоркі, Анатоля Лябедзькі, Аляксандра Мілінкевіча, Яўгена Афнагеля і Зьмітра Хведарука штраф памерам 2 135 974 руб. ($1000).

**Віцебск**

Рэдакцыі недзяржаўнай газэты **«Витебский курьер М»** зноў адмовілі ў праве ўнесьці зьмены ў статут і перарэгістравацца. Калегія Найвышэйшага гаспадарчага суду (НГС) адхіліла касацыйную скаргу ЗАТ «Выдавецкі дом «Витебский курьер» на рашэньні судоў папярэдніх інстанцый у гэтым пытаньні.

### 21 траўня

**Вушачы**

Моладзевых актывістаў **Кацярыну Салаўёву** і **Алеся Круткіна**, якіх затрымалі ў часе сустрэчы з моладзьдзю ў Вушачах (Віцебшчына), мясцовы суд аштрафаваў на 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. руб.). Суд прызнаў Салаўёву і Круткіна вінаватымі ў парушэньні арт.22.9 КаАП: згодна з пратаколамі, складзенымі ў пастарунку, моладзевыя актывісты распаўсюджвалі незарэгістраваную друкаваную прадукцыю — налепкі са словамі «Эўрапейская Беларусь» і «Полацак — горад наш!». Варта адзначыць, што пратаколы складалі не міліцыянты, а загадчыца ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму **Вольга Карчэўская**, якую адмыслова дзеля гэтага выклікалі з выканкаму ў райаддзел міліцыі.

**Менск**

Увечары супрацоўнік Маскоўскага РУУСу **Алег Трубіш**, участковы **Сяргей Кавалей**, а таксама некалькі асобаў у цывільным уварваліся ў прыватную кватэру ў Менску, дзе знаходзіліся актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» **Дзяніс Карноў** і **Вадзім Ханяўка**. У вынікуператрусу былі сканфіскаваныя бел-чырвона-белыя сьцягі і сьцягі Эўрасаюзу, друкаваная прадукцыя. Акрамя гэтага, супрацоўнікі ў цывільным перапісалі ўсю інфармацыю з кампутара, што знаходзіўся ў кватэры.

Каля 22-й маладафронтаўцаў адвезьлі ў Фрунзэнскі РУУС Менску без тлумачэньня прычынаў затрыманьня. Апаўночы, пасьля высьвятленьня асобаў, хлопцаў вызвалілі.

### 22 траўня

**Менск**

**Павал Юхневіч** і **Яўген Афнагель** завочна прысуджаныя да 7 сутак арышту за ўдзел у афіцыйным мітынгу 1 траўня. Нагадаем, што такія ж завочныя прысуды былі вынесеныя ў Першамайскім судзе Менску лідэрам незарэгістраванага «Маладога фронту» **Зьмітру Дашкевічу** і **Артуру Фінькевічу**. **Зьміцер Хведарук** пакараны 10 суткамі арышту і штрафам памерам 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс.).

**Віцебск**

Віцебскі актывіст **Барыс Хамайда** паведаміў, што на яго брата **Вячаслава** быў учынены напад. Паводле апісаньня Вячаслава Хамайды, малады хлапец гадоў пад дваццаць напаў на яго па дарозе зь лецішча: зьбіваў нагамі, да крыві разьбіў твар, і ўсё гэта моўчкі, безь ніякіх тлумачэньняў. У аддзеле міліцыі Віцебскага раёну паводле гэтага факту ўзбуджаная крымінальная справа. Б.Хамайда згадаў, што ўвосень мінулага году невядомыя хуліганы падобным чынам зьбілі 18-гадовага сына віцебскага сябра КХП-БНФ **Яна Дзяржаўцава**.

### 23 траўня

**Ворша**

**Аляксандра Мілінкевіча** і **Паўла Севярынца** затрымалі пасьля таго, як скончылася сустрэча з жыхарамі аднаго зь мікрараёнаў Воршы. У ГУУС палітыкаў адвёз **Юрась Губарэвіч**, у якога раней забралі правы на машыну. Што праўда, Губарэвічу пасьля аддалі правы на машыну і адпусьцілі. Пазьней затрыманых вызвалілі.

**СП**

# «Хадзілі і будзем хадзіць»

Старэйшыя актывісткі нацыянальнага руху **Ніна Багінская** і **Ядвіга Пятроўская** — пра сябе і час.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ніна Багінская (зьлева) і Ядвіга Пятроўская.

У кожным твары ёсьць нешта, што — нават калі чалавек ня хоча — пры першым жа поглядзе раскрые самую ягоную сутнасьць. Раз зірні — і ўсё, гатова, далейшае жыцьцё, як правіла, толькі пацьвердзіць тое, што ты зразумеў пра чалавека пры першым поглядзе. На сьвяткаваньнях Дня Волі, на Чарнобыльскіх шляхах, на Плошчы — мяне заўсёды зьдзіўляла і радавала, колькі там бывае прыгожых людзей. Але нават сярод іх — у гэтым калейдаскопе крэатыву і сьмеласьці моладзі, спакойнай вытрымкі людзей сярэдняга веку і правакацый «засланых казачкоў», якіх, дарэчы, таксама адразу вывіш за кілямэтар — прыцягваюць увагу жанчыны сталага веку. Іх заўсёды шмат, яны часта з нацыянальнымі сьцягамі ці сьцяжкамі, ці стужкамі, ці кветкамі, часта ў пары з мужамі. Чамусьці амаль усе яны мініятурныя, зграбныя, у элегантных капялюшыках ці хустачках; паглядзеўшы на такую, адразу ўяўляеш яе ў сям'і, дзе адной прысутнасьці бабулі на кухні дастаткова, каб усе сямейнікі адчувалі: усё ідзе як мае быць, сьвет стаіць, і жыцьцё можа быць шчасьлівым...

Гэтыя жанчыны старой загартоўкі, і такія дысцыплінаваныя і цягавітыя працаўнікі цяпер рэдкасьць. Часта даводзілася бачыць, якія яны адважныя.

Прыгадаўся выпадак: на Дні Волі ў 2007 г., калі палкоўнік Паўлічэнка, аддзелены шэрагам сваіх падначаленых у чорным, ішоў уздоўж праспэкту, шматтысячная шэсьце скандавала «Забойца! Забойца!». Пажылая невысокая і худзенькая кабета побач са мной, павярнуўшыся, падышла да самага шэрагу амапаўцаў і голасна, гледзячы ў твар Паўлічэнку, пракляла, каб ужо дакладна зразумеў: «Убийца. Убийца». Паўлічэнка прайшоў паўз яе — і, далібог, я ніколі ня бачыла, каб у чалавека так чырванела патыліца. А жанчына засталася ля шэрагу амапаўцаў, да яе падышлі сяброўкі, яны разам ішлі ўздоўж ланцугу салдат — і гаварылі з гэтымі хлопцамі.

Яны не лічылі бессэнсоўным гаварыць з салдатамі ў чорным, яны знаходзілі непустыя словы, ім адказвалі — і калі, магчыма, у салдацкіх вачах нешта нарэшце праблісьне, то дзякуючы падобным размовам.

Сёньня я б хацела пазнаёміць чытачоў зь дзьвюма такімі жанчынамі.

У грамадзтве, якое выглядае дэмаралізаваным, яны даюць прыклад стойкай маральнасьці.

## Каляжанкі

Спадарыні **Ніна Багінская** і **Ядвіга Пятроўская** — франтаўкі зь вялізным стажам. Спадарыня Ніна — прыхільніца КХП-БНФ («пазьняко́ўцы»), спадарыня Ядвіга — з партыі БНФ («вячоркаўцы», ці, можа, цяпер правільней казаць «баршчэўскаўцы»?). Яны знаёмыя з 1988 году, сябруюць, стала ўдзельнічаюць у розных франтаўскіх акцыях, у тым ліку і вулічных.

**«Наша Ніва»: Раскажыце, калі ласка, пра сябе.**

**Ніна Багінская:** Я нарадзілася ў 1946 г. Мая бабуля 1885 г.н. мела толькі хатнюю адукацыю, а дзед вучыўся ў Слуцкай гімназіі і потым працаваў поштмайстрам. І тая моладзь, нашыя бабулі і дзядулі, мела такі антыімпэрскі, антыцарскі настрой. Бабуля заўсёды казала, што добрыя і дрэнныя людзі ёсьць ва ўсіх станах насельніцтва, а што да цара — то ён, канечне, быў душыцель народу, але цяпер у Палітбюро — шмат душыцеляў. Вось, мусіць, з гэтых словаў і пачалося маё крытычнае асэнсаваньне таго, што адбывалася. А калі я паступіла ў Івана-Франкоўскі інстытут нафты і газу — бо заўсёды хацела быць геолягам — то да маіх антыкамуністычных перакананьняў дадаліся і нацыянальныя. Дзяўчаты ў інтэрнаце размаўлялі па-ўкраінску, і іх страшна дзівіла, што я не гавару па-беларуску. Ім гэта было незразумела. А тут яшчэ «Песьняры» прыехалі ў Івана-Франкоўск на гастролі... Такі быў посьпех! І водбліск гэтага посьпеху беларускіх песень як бы ўпаў на мяне. Прыехаўшы дамоў на вакацыі, дастала школьны падручнік і стала наноў вучыць мову.

**Ядвіга Пятроўская:** У мяне было ня так. Я таксама не валодала беларускай мовай. Выхоўвалася ў дзіцячым доме ў Барысаве, а потым мяне адаслалі ў вучэльню ў Рыгу. Але мова для мяне — сьвятая. Калі езьдзіла на старыя могілкі да сваёй мамы, а ў аўтобусе бабулькі размаўлялі па-нашаму — гэта было як мёд на сэрцы.

Перакананьні мае насамрэч утварыла само жыцьцё, мноства самых розных выпадкаў. Добра запомніўся, напрыклад, такі.

Аднойчы на заводзе, дзе я працавала, прапанавалі схадзіць на вечарыну ў Дом літаратара, прысьвечаную Талстому. Там выступаў, сярод іншых, Вячаслаў Адамчык. Ён ні слова не сказаў пра Талстога, але колькі сказаў пра Беларусь! І як ён гаварыў! Мне запомнілася на ўсё жыцьцё. Таму, прыкладам, мне цяпер непрыемна, калі пачынаюць нешта гаварыць крытычна пра Адама Глёбуса — для мяне ён найперш сын чалавека, які так палымяна любіў Беларусь. «Чужую Бацькаўшчыну» я не магу чытаць — настолькі гэта маё, балючае, невыноснае... «Леанарду» таксама... Я сама жыла ў партызанскай зоне, бачыла партызан. Памятаю, ноччу прыйшлі партызаны, мне было гадоў пяць, я спала ў дзедавай хаце, і мая мама схавала апошні акрайчык хлеба мне пад бокам... Але я не магу гаварыць пра гэта, дужа балючая тэма.

У 1988 г. мой сын, які быў тады ў «Талацэ», аднойчы вечарам прыбег дадому такі ўзрушаны і крычыць: «Мама, у нас створаны Народны Фронт, мама!» А я яму: «Цішэй, цішэй!» — бо баялася, што пачуюць суседзі *(сьмяецца)*. І вельмі хутка зразумела, што падзяляю ідэі БНФ, і пачала ўдзельнічаць у яго рабоце.

**НБ:** Я ў Фронце з самага пачатку, з устаноўчага зьезду. Прыносіла на працу матэрыялы з устаноўчага сходу «Мартыралёгу Беларусі». Потым стварыла суполку на месцы працы. Наша суполка ўвайшла ў Раду Партызанскага раёну, якую ўзначальвалі Артур Вольскі ды Юры Дракахруст.

## Франтаўкі на працы

**«НН»: Як складалася Вашае прафэсійнае жыцьцё?**

**НБ:** Пасьля заканчэньня інстытуту я пайшла працаваць у БелНДГРІ — гэта геалягічны прамысловы інстытут у Сьцяпянцы. Працавала там геолагам, навуковым супрацоўнікам у аддзеле літалёгіі, то бок у аддзеле, які займаўся апісаньнямі парод. Не хавала сваіх поглядаў, таму праца не складалася бясхмарна. Бо там працавалі розныя людзі.

Напрыклад, у нас працаваў вельмі непрыемны чалавек Маліджан Ібрагімавіч Ісафараў, які быў адказным за грамадзянскую абарону і пахваляўся, што быў служкам Цанавы, варыў яму плоў на лецішчы (дарэчы, лецішча Цанавы акурат у Сьцяпянцы, недалёка ад нашага інстытуту). Дык вось, калі ў інстытуце мужчыны адзначалі ў яго кабінэце 23 лютага, ён даставаў з сэйфу пісталет і расказваў, як у 37-м дзяржальнам гэтага рэвальвэра біў па галовах «ворагаў народу» і як цякла кроў...

Пасьля ўстаноўчага зьезду я павесіла абвестку, што ў перапынак на абед раскажу пра тое, што там было. На зьезьдзе пачула праўду пра Чарнобыль, і ўсё расказала супрацоўнікам. Прыйшлі ўсе — і хто за, і хто супраць. Мне спрабавалі даць за гэта вымову, але не далі — бо кіраўніцтва само шмат чаго даведалася, асабліва што датычыла Чарнобыльскай зоны: мы там працавалі, а пасьля майго выступу нас перасталі туды пасылаць...

Потым я павесіла ў Інстытуце стэнд БНФ — з «Пагоняй» і нацыянальным сьцягам. Дырэктар Кавалёў мне сказаў: «Зьнiмiце!» А я адказала: «Вось вы, сын рэпрэсаванага, ідзіце і самі зьніміце, а я сваімі рукамі зьнімаць ня буду!» Так стэнд і застаўся на месцы...

Зрабіць са мной нічога не маглі: я — маці дваіх дзяцей, і такую жанчыну так проста звольніць нельга. Тым больш, я наведвала ў Ліцэі ўрокі палітэалёгіі, якія ладзіў Анатоль Сідарэвіч, і ён нас вучыў, як дасьціпна сябе абараняць.

Потым Беларусь стала незалежнай, і недзе да 1993 году мае апанэнты замаўчалі. Кіраўнічка аддзелу кадраў ужо не крычала на мяне: «Пайдзі палячысь, шызафрэнічка, мы заўсёды былі і будзем пад Масквой!» Раптам Масква некуды падсунулася! *(Сьмяецца.)*

А ў канцы 1993-га я заўважыла, што ўсе гэтыя камуністы, расейскія шавіністы зноў заварушыліся. У нас у гэты час была пераатэстацыя. На ёй мяне спрабавалі абвінаваціць, што мае мапы няможна выкарыстоўваць. Але я была падрыхтаваная і прынесла характарыстыку ад спэцыялістаў, якія маімі ж мапамі і карысталіся і былі імі задаволеныя.

Калі не ўдалося звольніць паводле вынікаў пераатэстацыі, за мной сталі сачыць і сказалі, што, калі хоць раз спазьнюся, мяне звольняць. Я не спазьнялася.

Але ўрэшце мяне звольнілі за тое, што, працуючы над расейска-беларускім геалягічным слоўнікам, я некалькі дзён правяла ў бібліятэцы. Я судзілася з інстытутам, але мяне не ўзнавілі. Што ж, з тых часоў я шчыльней занялася грамадзкай дзейнасьцю.

Затым уладкавалася ў мастацкую вучэльню вахцёрам — там шмат было нашых людзей. У нашай суполцы было шмат актывістаў — Банкевіч, Купава, Юхо... Але пасьля рэфэрэндуму 1995-га нас пачалі элемэнтарна звальняць.

**ЯП:** Я з 14 год у машынабудаваньні, 41 год адпрацавала. Пачынала токарам. Апошнія 20 год працавала на «Амкадоры» інжынэрам. У нас на вытворчасьці свае парадкі. Нельга спазьніцца ні на хвіліну! Кожны раз, калі БНФ нешта ладзіў, у нас рабілі працоўны дзень. І паспрабуй не прыйсьці, вылеціш з работы ў момант! Але мы неяк уладкоўваліся: калі ў 1991 г. трэба было, напрыклад, стаяць на плошчы, мы зь сяброўкай пасьля працы хуценька пілі гарбату, а потым беглі на плошчу і знаходзіліся там да адзінаццатай вечара, а раніцай — зноў на работу.

### Дома і на лецішчы

**«НН»: Як Вы спалучаеце сваю дзейнасьць зь сям'ёй?**

**НБ:** І сын, і дачка, і ўнукі падтрымліваюць... Мы аднадумцы.

**ЯП:** Вядома ж, суседзі, родныя ведаюць пра мае перакананьні. У маім пад'езьдзе жывуць розныя людзі: і абыякавыя, і камуністка такая Людміла Аляксандраўна, і тыя, хто заўсёды падпісваюць мае падпісныя лісты. У электрычцы, у транспарце я часта далучаюся да размоваў, выкладаю сваю пазыцыю. Мне, бывае, гавораць: навошта, ты ўсё роўна не пераканаеш апанэнта. А я адказваю: заўсёды ёсьць нэўтральныя вушы, нэўтральныя людзі — вось дзеля іх я і гавару.

**«НН»: Ці Вы любіце лецішча?**

**НБ, ЯП** *(у адзін голас)*: Вельмі!

**НБ:** А яшчэ я вельмі люблю шыць, вязаць, ткаць.

**ЯП:** Зьвярніце ўвагу, вось гэтая торбачка, шапачка, шалік — усё яна сама зьвязала.

**«НН»: Вельмі стылёва.**

**ЯП:** Я тут прынесла з сабой фатаграфіі, давайце паглядзім. Іх рабіў Карміэлкін. Вось Вера Царлюкевіч. Вось Калубовіч. Вось Бураўкін, Барадулін. Вось у Доме літаратара — я...

**«НН»: Якая Вы прыгожая.**

**ЯП:** Сокалаў-Воюш, Сыс... Спадарыня Апейка... Ці жывая яна? Алена Дзенісевіч, выйшла потым замуж за вялікага начальніка, перастала хадзіць... Аксана Верамей... А гэта мая сяброўка Надзея Дземіідовіч. Яна была ў СБМ, адседзела 25 год. Ёй цяпер 81 год... А тут вясельле Пазьняка. Калі Галіна і Зянон пажаніліся, я прапанавала адзначыць іхнае вясельле ў нашай радзе ў складзіны. Выйшла добра! Галіна была старшынёй нашай рады. А Пазьняка я пабойвалася.

### «Я плакала ад роспачы»

**НБ:** Пазьняк надзвычай цэльны чалавек. Мне расказвала сяброўка, якая зь ім працавала, што ў яго прысутнасьці — а ў інстытуце іхным быў амаль жаночы калектыў — жанчыны зь яго аддзелу ніколі не гаварылі пра кухню, пялюшкі: ім было сорамна, бо для яго існавала толькі праца. Ім сорамна было малоць языкамі. І як палітык ён адбыўся. Ён зрабіў шмат, як ніхто. Пазьняк і Галіна — максымалісты. Яны што думаюць, тое кажуць. Не хітруюць. Але калі б ён хітраваў, то такія, як я, яму б не далі веры. Цяпер у замежжы рэалізуе сябе — і дзякуй Богу.

**ЯП:** А я са многім у яго дзейнасьці нязгодная. Напрыклад, калі ён гаварыў пра люстрацыю... Я не разумею, як такое магло быць: раніцай чую ў «Радыёфакце», як «паліваюць» БНФ, а потым я прыходжу на сядзібу — а там факс ад Пазьняка, у якім ён «палівае» Фронт яшчэ больш!.. Пазьняк сапраўды максымаліст. Нас ня так многа, каб варагаваць, здаецца, трэба разам гуртавацца — дык не, гэтыя 100 чалавек ходзяць упарта асобна...

**«НН»: Чаму ж, па-Вашаму, адбыўся гэты раскол?**

**ЯП:** Хто яго ведае, чаму так адбылося. Калі ў 1999-м адбываўся гэты раскольны працэс, я плакала, проста плакала. Ад узрушэньня, ад роспачы.

**Гэтае знакамітае фота было зробленае 25 Сакавіка 2006 году. Многія думалі, што на ім са сьцягам стаіць школьніца. Між тым то была гераіня гэтага матэрыялу... Як вы думаеце, каторая зь іх?**




### Новы прэзыдэнт

**«НН»: Якога лідэра Вы чакаеце, якому лідэру дасьцё веры?**

**НБ:** Прэзыдэнт, якому я дам веры, першае, што зробіць, — скасуе прэзыдэнцкую ўладу. Мне падабаецца Севярынец. Ён разумны, разумнейшы за нас. Ён шчыры вернік, што пра многае гаворыць.

**ЯП:** Апошнім часам заўважаю за сабою: мне нецікавае расейскае тэлебачаньне, расейская эстрада, літаратура. Затое мне цікава хадзіць у кансэрваторыю, на канцэрты беларускіх выканаўцаў, на выступы беларускіх пісьменьнікаў. Калі гаварыць пра лідэра дзяржавы, то ён павінен быць беларусам.

### Уражвае нялюдзкасьць

**«НН»: За доўгі час, што Вы ў Фронце, якія выпадкі найбольш уразілі? Што найбольш запомнілася?**

**НБ:** Апошні Дзень Волі ўразіў. Хапалі моладзь, валаклі, таўклі нагамі. Бачыла, як хлопца, дзіця 16 год, валаклі за рукі так, што ў яго сьпінка голая цягнулася па сьнезе, а яго яшчэ падбіваюць нагамі. Калі я падышла да аўтобуса і зьвярнулася за начальніка іхнага са словамі «Што вы робіце? Гэта ж фашызм!», то ён кінуў: «І яе туды ж». Пасьля таго, як мяне завялі ў аўтобус, туды запіхнулі і нейкую дзяўчыну. І яна спытала ў мяне: «У вас няма нічога ад сэрца? Не магу дыхаць». У мяне не было таблетак, яны мне ніколі не патрэбныя. І тады я адкрыла рот і заявіла гэтым чорным: «Або выклікайце хуткую, або выпускайце нас адсюль, бо калі ёй тут стане дрэнна, то вы ўжо наагул нелюдзі». Яны нічога не сказалі, але калі з аўтобуса выходзілі спэцназаўцы, я падняла дзяўчыну, і мы таксама выйшлі, і нас ніхто не затрымаў.

На судах гаспадарыць ня тое што міліцыя, а нейкія людзі ў шэрым: яны ўпускаюць ці не пускаюць, яны правяраюць рэчы, а калі гаворыш ім — прадстаўцеся, то хамяць... Аднойчы на судзе я нават падышла да міліцыянтаў і спытала: «Хлопцы, чаму вы дазваляеце, каб гэтыя невядомыя тут гаспадарылі?» І ім не было чаго адказаць, яны толькі крыва пасьміхаліся...

**ЯП:** Запомнілася, калі ўпершыню падчас праўленьня Лукашэнкі супраць нас, мірных дэманстрантаў, міліцыя груба ўжывала сілу. Гэта было на плошчы Незалежнасьці, ля Чырвонага касьцёлу. Цяпер мы ўжо падрыхтаваныя да такога, а тады было так страшна... Памятаю, пасьля гэтага я зайшла ў касьцёл і горача малілася Сьвятой Дзеве... Запомніліся падзеі пасьля выбараў 2006 г. Як мы, мамы і бабулі, не давалі аўтобусам з затрыманай моладзьдзю выехаць з Акрэсьціна, як на Дзень Волі амапаўцы запіхвалі нас ў пераход ля ЦУМу, як у другую Нямігу... Як баялася тады, каб не затапталі...

**«НН»: Чаму Вы тады працягваеце хадзіць? Чаму працягваеце рызыкаваць здароўем, нэрвамі?**

**НБ:** А іншага выйсьця няма. Трэба сябе бараніць.

**ЯП:** Калі б многа людзей хадзіла — я ня стала б ужо. Займалася б сваім агародам, лецішчам, якое вельмі люблю, культурай. Але Беларусь — гэта сьвятое, гэта не кан'юнктура. Я не за ўладу змагаюся — дзе мне ўжо палітыкай займацца! Але я за Беларусь. Душа не старэе, гэта сапраўды так, я гэта адчуваю. Усё ў руках Божых. Кожны беларус, дзе б ні жыў, павінен працаваць на Беларусь. Трэба рабіць, што можаш.

**Гутарыла**
**Наталка Бабіна**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

## Вялікі дзякуй!

**Сяргею Ц.** зь Докшыцкага раёну.
**Барысу В.** з Баранавіцкага раёну.
**Міхаілу Т.** з Слуцкага раёну.
**Георгію С.** з Аршанскага раёну.
**Тадэвушу Ш.** з Маладэчанскага раёну.
**Віталю Ц.** са Жлобінскага раёну.
**Ігару Дз.** зь Берасьця.
**А.Ж.** з Барысаўскага раёну.
**М.Х.** са Шчучынскага раёну.
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Ігару М., Анатолю Б.** з Магілёва.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Алене М., В.Л., Сяргею К., А.Я., Фёдару П., Веры С., Аляксандру П.** зь Менску.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перsucceeded pераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## Сям'я Брыля праігнаравала адкрыцьцё дошкі па бацьку

**У аўторак раніцай дачцэ Янкі Брыля Галіне патэлефанавалі з упраўленьня культуры Менгарвыканкаму і паведамілі, што заўтра на доме №78 па праспэкце Машэрава будзе ўстаноўленая мэмарыяльная дошка. У гэтым доме клясык нашай літаратуры жыў апошнія дванаццаць гадоў перад сьмерцю. Цяпер у двухпакаёвай кватэры Янкі Брыля жывуць абедзьве дочкі пісьменьніка.**

На роспыты Галіны Брыль, а якой гадзіне адбудзецца адкрыцьцё дошкі, хто будзе ўдзельнічаць у гэтай цырымоніі, ёй паведамілі, што саму дошку прымацуюць да сьцяны да 12 гадзін, а яе ўрачыстае адкрыцьцё адбудзецца ў 12.30. Адкрываць жа дошку будуць «людзі з Саюзу пісьменьнікаў». У адказ на пытаньне спн.Галіны, зь якога пісьменьніцкага саюзу будуць тыя людзі, ёй назвалі прозьвішчы Мікалая Чаргінца, Уладзімера Гніламёдава і Аляксандра Жука (ня блытаць з празаікам Алесем Жуком).

Галіна Брыль заявіла прадстаўніцы ўпраўленьня культуры, што яна на цырымонію адкрыцьця мэмарыяльнай дошкі ня прыйдзе. Другая дачка Янкі Брыля — Натальля Семашкевіч — цяпер знаходзіцца на лецішчы свайго бацькі ў пасёлку Крынічнае Карэліцкага раёну і таксама ня мае намеру ўдзельнічаць у адкрыцьці мэмарыяльнай дошкі. Сын пісьменьніка, кандыдат фізыка-матэматычных навук Андрэй Брыль, займаецца цяпер дасьледаваньнямі ў Японіі і мае намер прыехаць на радзіму 30 траўня.

Літаратурны крытык Анатоль Сідарэвіч, які 41 год ведаў Янку Брыля асабіста, так тлумачыць факт адмовы дачок Янкі Брыля ўдзельнічаць у адкрыцьці мэмарыяльнай дошкі:

«Брыль да канца дзён належаў да Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і не ўваходзіў у «правільны» Саюз пісьменьнікаў Беларусі. Па-другое, Мікалай Чаргінец удзелам у цырымоніі адкрыцьця дошкі яўна прымазваецца да імя нашага клясыка. Трэба памятаць, што менавіта ад Чаргінца ў многім залежала, ці будуць пахаваны жонка Янкі Брыля і сам пісьменьнік у Менску. Улады не дазволілі пахаваць спадарыню Ніну Брыль на Кальварыі, як таго прасіў яе муж. Ніна Міхайлаўна была пахавана ў Калодзішчах. Там — побач зь ёю — знайшоў вечны спачын і наш клясык. Так улада, і ў тым ліку Чаргінец, абразілі выдатнага дзеяча беларускай культуры, вэтэрана Другой усясьветнай вайны (а Брыль ваяваў з 1 верасьня 1939 году) і ўдзельніка партызанскага параду 1944 году ў Менску. Абражана была і ўся сям'я Брылёў. Вядома, добра, што ўлада адчыняе дошку, але ўзначаліць гэтую цырымонію яна даручыла не таму чалавеку. І гэтым, зноў-такі, абражае памяць Янкі Брыля».

**Сябар сям'і**

## Кіно і сэкс

**Пры паказе фільму «Сын за бацьку» на ТВ выразалі пікантную сцэну.**

Людзі старэйшага веку памятаюць польскі фільм «Новыя амазонкі». Фантастыка, арыгінальная і не бяз гумару. Але разынка (хутчэй, сунічка) ня ў гэтым — у фільме — о, жах ! — дзенідзе праглядвае голае жаночае цела! Шок для савецкага грамадзяніна! Але потым аказалася, што дзеячы культуры зь міністэрства ўсё ж такі падбалі пра эстэтыку. Самыя прывабныя кадры былі выразаныя. У Савецкім Саюзе сэксу няма. Жаночая грудзі — сымбаль мацярынства, ня месца ім на кінаэкране. Дый сам фільм у савецкім пракаце з арыгінальнай «Сэкс-місіі» быў перайменаваны ў «Новыя амазонкі». Але мастацтва не стаіць на месцы. Не стаяць на месцы і барацьбіты за маральнасьць.

Фільм «Сын за бацьку» ў нейкай ступені культавы ў нашай краіне — некалькі разоў на год паказваюць. Але, на дзіва, з кожным паказам ён становіцца карацейшым. У «бардаку» 1990-х была поўная вэрсія: саўна ў аздараўленчым цэнтры, голыя дзеўкі... «Дык гэта ж парнаграфія!» — усклікне беларус. І сапраўды, як такое можна па тэлевізары паказваць — моладзь разбэшчваецца. Вось і выйшла спачатку вэрсія фільму, дзе «оргія» паказана як бы ў скароце — нічога нельга разгледзець, але сэнс зразумелы. А цяпер фільм стаў увогуле шэдэўрам — сцэна выразана цалкам! Галоўны герой, каб трапіць у памяшканьне аздараўленчага цэнтру, прайшоў праз цеплавузел і апынуўся... у міліцыі. З гэтага і пачынаецца канфлікт.

Добра, што фільм раней паказвалі, а то гледачу цяжка разабрацца, з чаго ўвесь вэрхал усчаўся. А так усё зразумела. Можна нават усю сярэдзіну фільму выразаць, пакінуць толькі пачатак і канец — астатняе і так усе ведаюць. Фільм ў гэтым ніколькі ня страціць, а моладзь ня ўбачыць гэтага бруду.

Але справа ня ў гэтым, а ў тым, што парнаграфія на экране ўсё-ткі застаецца, у самым непрыглядным сьвятле. І хай сабе ў заходніх фільмах, а то ж у нашых, беларускіх! На гэтым трэба паставіць кропку! Ад імя грамадзкасьці патрабую: апраніце ўрэшце Тарзана ў «Анастасіі Слуцкай» у паласатыя «сямейныя» трусы — не разбэшчвайце моладзі.

**Алесь Рыбачонак, tut.by**

## У новым корпусе Мастацкага музэю працёк дах

**Выстава Пікаса «зачыненая з тэхнічных прычынаў». Дарэчы, з экспазыцыі музэю нядаўна прыбралі славутую «Пагоню» Драздовіча.**

Як насіліся з выставай Пікаса перад «ноччу музэяў»! А цяпер яна «зачыненая па тэхнічных прычынах». На пытаньне «ці надоўга?» у касе адказваюць: «Можа, на тыдзень, можа, больш». Аказалася, у новым будынку працякае дах. Са старым, здаецца, такога ніколі не здаралася. Праз залевы прыйшлося ня толькі прычыніць выставу керамікі, але і некаторыя карціны разьмясьціць на падлозе.

Заўважна, што зьяўленьне новага будынку мала паўплывала на пашырэньне экспазыцыі: туды папросту перанесьлі частку выстаўленага са старога. На пытаньне, ці зьбіраецца музэй пашырацца, экскурсаводка расказала, што ўвогуле ў залях выстаўлена 4 % усяго фонду. Астатнія 96 % — у запасьніках у падвале. І зьменаў пакуль не плянуецца. Лічба гэтая ўражвае. Застаецца толькі здагадвацца, колькі шэдэўраў Драздовіча (нядаўна, дарэчы, з экспазыцыі была прыбрана яго славутая «Пагоня»), Селешчука і іншых творцаў пакрываецца пылам. А такімі залевамі дык хутка беларусы страцяць і тыя 4 %, што ёсьць у «свабодным праглядзе».

**Паўліна Панасюк, Менск**



Грамацеі з вышшым абразаваньнем... Фота зь Берасьця даслаў Юрка Бакур.

* * *

**Калі кажуць, колькі вёсак у Беларусі зьнішчылі фашысты, дык патрэбна назваць колькасьць вёсак, якія зьнішчылі саветы.** Загналі сялян у калгасы, разбурылі гаспадаркі, вёска пачала выміраць. Моладзь пасьля вайны праўдамі ці няпраўдамі пачала шукаць паратунку ад калгаснага рабства й разьбягацца па неабсяжных абшарах імпэрыі, ад Карэліі да Камчаткі, а старэйшае пакаленьне паступова сыходзіла ў нябыт.

**Мікола Канаховіч, Пружаны**

* * *

**Адключэньне гарачай вады на ўсё лета,** а то і адразу пасьля заканчэньня ацяпляльнага сэзону і да пачатку наступнага стала шматгадовай «традыцыяй» амаль для ўсіх райцэнтраў краіны.

**Зося**

## ВОДГУКІ

### «Эўрабачаньне»

Па-першае, згадзіцеся, другі паўфінал быў зашмат мацнейшы за першы.

Па-другое, Аляхно ня проста фальшывіў, а не пападаў нават у простыя расьпеўкі, гэта было чуваць вельмі добра. Эўропе не патрэбен другі Білан, як сказала Стася з групы, якая выступала ў адборачным беларускім Эўрафэсьце.

Па-трэцяе, хваляваньне перад 25-тысячным натоўпам нікуды ня дзенеш, які б прафэсіянал ні выступаў, я лічу.

Па-чацьвертае, як могуць знайсьці адну мову падтанцоўка з Грэцыі, здаецца, бабруйчанін і маскоўскія прадусары? Дзеякі мала што скакалі не сынхронна і так ужо проста, дык і ў падпеўцы «нападпявалі» такой брыдоты! Жах!

Успомніце, як арганічна і цудоўна глядзеліся нумары з нацыянальным калярытам, сьпевам і інш.Так, у нас былі Аляксандра і Канстанцін, але гэта было даўно і няпраўда. Яшчэ раз кажу, трэба везьці туды сваё, нацыянальнае, ды так ударыць сьпевам, каб уся Эўропа здрыганулася.

І усё больш і больш пераконваюся, што Эўрабачаньне — гэта больш фартуна, чым палітыка ці прафэсіяналізм.

**Воля Вольная**

### Чалавечае і палітычнае: Салаш (№19)

Прыемна было пачытаць. Гучыць супэрапазытыўна, але пры тым проста і шчыра. Зычу посьпехаў, Сяргею! Калі трэба практыка ў нямецкай, сардэчна запрашаю.

**Ірына, Вена**

### «Крыж пакаяньня», №18

Дэмуха цяжка назваць «ідэйным», бо ў лес ён пайшоў не з «палітыкі», так ужо склаліся абставіны. І неўзабаве стаў ён мясцовым Робін Гудам. А вось Янка Раманчук — ідэйны змагар, беларускі нацыяналіст. Яшчэ жывыя сувязныя яго атраду, якія пра гэта сьведчаць. Ён і патаемную арганізацыю заклаў са студэнцкай моладзі — Саюз змаганьня за незалежнасьць Беларусі. Адседзеў 25 гадоў, і савецкія канцлягеры яго не зламалі. Ён застаўся беларускім патрыётам... Партызаншчына — гэта заўсёды кроў, часам нявінных ахвяраў. У апошнім нумары ARCHE ўздымаецца тэма ахвяраў «лясных братоў» — пэўная частка іх была агентамі МГБ.

**Кастусь**

### «Выбары-2008. Хто па якой акрузе ідзе», №19

Я ня ведаю такіх партыі і арганізацыі, якія былі б ідэальныя, дзе б усё было ладна. Нагледзеўся я і наслухаўся такога, што ў адзін момант лічыў, хай лепей Лукашэнка, чым яны. На жаль, няма сёньня сярод нас Кастуся Каліноўскага... Нацыянальныя героі заўжды змагаліся нягледзячы на цяжкасьці і перашкоды, ім было ўсё роўна, дзе спаць і што есьці. Сёньняшнія лідэры далёкія ад таго, каб называць іх героямі, перш прапіхваюць сваё «я», любяць добра паесьці і пагуляць. І ня дай Божа пайсьці супраць іх: адразу станеш агентам КДБ, здраднікам ідэі. І тым ня менш, я прапаную аб'ядноўвацца ўсім, нягледзячы на тое, чый партрэт «вісіць» у каго ў хаце — Пазьняка, Мілінкевіча, Вячоркі, Казуліна ці іншых. Трэба працаваць дзеля Беларусі і яе вызваленьня, а не на партыйных лідэраў.

**Друг Колас**


# Аўдыёкніга для кожнай беларускай сям'і




Адрасаваная юным беларусам кніга Уладзімера Арлова «Адкуль наш род», добра знаёмая чытачам самага рознага веку — усім, хто цікавіцца гісторыяй. Пра гэта сьведчаць і чатыры выданьні, і шматгадовая прысутнасьць кнігі ў школьных праграмах.

Нядаўна пабачыла сьвет пятае выданьне — гэтым разам у фармаце аўдыёкнігі. Яе складаюць займальныя і пазнавальныя апавяданьні, у якіх наша гісторыя падаецца праз лёсы знакамітых продкаў.

Сярод герояў Арлова — князі Ўсяслаў Чарадзей і Вітаўт Вялікі, першадрукар Францішак Скарына і канцлер Леў Сапега, ваяводы Канстанцін Астрожскі і Ян Кароль Хадкевіч, правадыры паўстанцаў Тадэвуш Касцюшка і Кастусь Каліноўскі, паэты Мікола Гусоўскі і Максім Багдановіч, «бацькі» Беларускай Народнай Рэспублікі Іван і Антон Луцкевічы...

Падкрэсьліваючы выключную ролю, якую у нашай гісторыі зь першых яе стагодзьдзяў адыгрываюць жанчыны, Уладзімір Арлоў апавядае пра княгіню Рагнеду, асьветніцу Эўфрасіньню, удзельніцу вызвольнага паўстання 1831 года Эмілію Плятэр, паэтэсу Цётку...

Храналягічныя межы 30 разьдзелаў кнігі — ад зьяўленьня на сучаснай тэрыторыі Беларусі першых людзей да абвяшчэньня незалежнасьці БНР.

«Адкуль наш род» — першая беларуская аўдыёкніга, якую начытаў сам аўтар. Кніга мае багатае гукавое афармленьне і аздобленая малюнкамі мастака Віктара Сташчанюка. У яе арганічна ўвайшоў музычны «кампанэнт», дзе вылучаюцца кампазыцыі гурту сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса». Сярод ліку выканаўцаў уштукаваных у кнігу вершаў — выдатны актор Віктар Манаеў.

ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ

# Генадзь Бураўкін: «Таленты не пахаваеш жандарскімі мэтадамі»

Генадзь Бураўкін з задавальненьнем прымае гасьцей у сваёй бальнічнай палаце, нягледзячы на дзьве перажытыя за тыдзень апэрацыі. «Не даюць скласьці крылы», — з усьмешкаю кажа паэт. Да яго пастаянна заходзяць ды тэлефануюць. Рыгор Барадулін падтрымаў сябру жартам перад апэрацыяй: «Станеш пасьля яе празорцам». Нават дэлегацыя з «Маладога фронту» наведала, узьнялі паэту настрой. Спадар Генадзь сам зьвярнуўся да мэдыкаў, адчуўшы, што пачаў сьлепнуць. Дыягназ — гляўкома левага вока. Дзьве апэрацыі прайшлі добра. «Спадзяюся захаваць абодва вокі», — спакойна кажа ён і пытаецца, што адбываецца ў краіне. Апавядаю, між іншага, што Арлову не дазволілі выйсьці на сцэну на прэзэнтацыі складанкі «Незалежныя», Марачкіна ізноў цягаюць праваахоўныя органы, гэтым разам за «Лялькі»…



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Спадар Генадзь, чаму, па-Вашаму, такая пільная ўвага да творцаў з боку дзяржавы?**

**Генадзь Бураўкін:** Гайкі зацiскаюць усё больш сур'ёзна. І такія выпадкі апошнім часам ужо ня дзівяць. Але ж тое, што адбылося з маім добрым сябрам Аляксеем Марачкіным, мяне зьдзіўляе нават па нашых мерках. Ужо карціна можа даць падставы да прыцягненьня да судовай адказнасьці. Дык тады можна прыйсьці да судоў над аўтарамі шаржаў ды эпіграмаў. Чэрчыль яшчэ казаў, што трэба насьцярожыцца, калі карыкатуры на палітыка зьнікаюць з газэтаў. Баюся гэта гаварыць, што за ўсім гэтым праглядаецца напамін пра той страшны 37-ы год у адносінах да інтэлігенцыі.

**«НН»: Згадваецца вечарына з нагоды вашага 70-годзьдзя, якую намагаліся забараніць. Ці Вы самі не трымаеце крыўды на тых чыноўнікаў, на тых людзей, якія маглі б падтрымаць Вас, але не зрабілі таго? Тыя ж Паплаўская зь Ціхановічам, якія шмат у чым Вам абавязаны, на тую вечарыну так і не прыйшлі…**

**ГБ:** Да Ядзі з Сашам крыўдаў не маю. Яны гатовыя былі прыйсьці ў той дзень, калі б папрасіў. Але думаў пра іх, пра тое, што ім пасьля будзе цяжка, што ім не дадуць нармальна працаваць. І я ім сказаў, што ня трэба прыходзіць. Тым больш, няма чаго крыўдаваць на чыноўнікаў, бо не яны прымаюць рашэньні. За іх гэта робяць два—тры чалавекі, якія ня тое што ня ведаюць, ня любяць беларускае, а проста ненавідзяць. Яны не самастойныя, сёньня — такія, а заўтра будуць дарыць кветкі і падганяць машыну да пад'езду. Але людзі не залежаць ад іх. З прыемнасьцю прыгадваю, колькі чалавек прыйшлі ў той дзень, для якіх цікава і дорага тое, што я раблю.

**«НН»: Але няўжо нічога ў Вас не зварухнулася ад той навіны, што наўзамен вашай «Калыханкі», якая столькі год гучала на БТ, сёлета запісалі новую ў выкананьні Дарафеевай?**

**ГБ:** Быў бы толькі рады, каб тая калыханка была цікавейшай. Час вымагае зьменаў. Новай «Калыханкі» я ня чуў, але тэкст яе прачытаў. Даруйце, але ён паэтычна недасканалы, выпадковы. Там няма нічога свайго: ні сваіх інтанацый, ні сваіх вобразаў, ні сваёй унутранай мэлёдыі. Я ж не вінаваты, што ў нас выйшла такая добрая «Калыханка», якую палюбілі дзеці. І не вінаваты, што маю прозьвішча Бураўкін, якое ўнесена ў забаронныя сьпісы. Я б на месцы Ірыны Дарафеевай захоўвала павагу да сваіх настаўнікаў. Яна, між іншага, вучаніца Васіля Раінчыка, які напісаў музыку да маёй «Калыханкі», і мяне добра ведае. Але, відаць, яе новыя настаўнікі вучаць паводле нейкіх іншых правілаў.

**«НН»: Тым ня менш, хоць Ваша пэрсона ігнаруецца дзяржаўным тэлебачаньнем начыста, шмат якія песьні Вашага аўтарства працягваюць гучаць і на радыё, і на тэлебачаньні. Якія маеце эмоцыі, калі чуеце, як на афіцыёзным мерапрыемстве чарговы раз зацягваюць «Завіруху»?**

**ГБ:** Мне прыемна, што гэтая песьня так доўга жыве. І гучыць яна не таму, што мяне нехта палюбіў, а таму, што за больш чым 10 год не зьявілася нічога новага. Прылашчаныя чыноўнікамі музыкі і паэты, якіх яны ўсё ўздымаюць ды ўзнагароджваюць, ня здолелі нічога стварыць такога, што гучала б хоць бы ўпоравень зь песьнямі, напісанымі ў свой час Гілевічам і Зарыцкім, Някляевым ды Захлеўным, Барадуліным і Ханком. Вось пра што чыноўнікам трэба задумацца: чаму цяпер няма такіх песень, якія б падхапілі людзі.

**«НН»: Што асабіста Вас захапіла з апошніх твораў, пра якія не пачуць на дзяржаўных мэдыях?**

**ГБ:** Найперш вылучу бліскучую рэдкую кнігу на многія гады — «Ксты» Рыгора Барадуліна. Выдатныя новыя творы Віктара Казька і Ўладзімера Някляева. Па-новаму стаў пісаць Анатоль Вярцінскі. Вельмі рады, што праз колькі год маўчаньня ён зноў заявіў пра сябе. Вельмі цікава моладзь працуе. Вартага вельмі многа. Іншая справа, што гэта хаваецца ад шырокіх масаў, як мы прывыклі казаць. Дзяржаўныя ігнаруюць, а ў незалежных выданьняў, на жаль, вузкі абсяг чытачоў.

**«НН»: Ці не настальгуеце па ранейшых часах, ранейшых накладах, ранейшых магчымасьцях?**

**ГБ:** Не магу сказаць, што я абмінуты ўвагаю ці абсалютна не заўважаны. Вось, у апошнім нумары «Дзеяслова» выйшла падборка маіх новых вершаў. Зусім нядаўна Зьміцер Вайцюшкевіч цэлы дыск запісаў на мае лірычныя вершы. Канечне, хацелася, каб тыя песьні гучалі на тэлевізіі і радыё, бо яны ня горш за тыя, якія там цяпер раскручваюцца. Веру, што час паставіць усё на свае месцы. Няхай і са спазьненьнем. Таленты не пахаваеш жандарскімі мэтадамі.

**«НН»: Хачу спытаць у Вас як у чалавека, які стаяў на чале Белтэлерадыёкампаніі больш за дзесяць гадоў: ці здольнае хоць неяк паспрыяць давядзеньню да шырокіх масаў сапраўдных твораў незалежнае беларускае тэлебачаньне? Якім яно Вам бачыцца?**

**ГБ:** Яно абсалютна неабходна, бо тэлебачаньне — самая магутная крыніца інфармацыі. У нашым выпадку тут вялізная тэхнічная, а значыць, і фінансавая, праблема. Сытуацыя зь «Белсатам» пра тое сьведчыць — пахваліцца вялікай аўдыторыяй канал ня можа. Як бы я хацеў, каб у нашай прасторы незалежныя тэлеканалы і радыёстанцыі канкуравалі на роўных зь дзяржаўнымі. Людзі глядзелі б найбольш цікавае, і гэтыя ўсе блізьнюкі, як я іх называю, — Першы канал, АНТ, СТВ — намагаліся б падцягнуць свой прафэсійны ўзровень. У сёньняшняга беларускага дзяржаўнага тэлебачаньня тры агромністыя недахопы: гэта небеларускае, неінтэлектуальнае, непрафэсійнае тэлебачаньне. Мяркую, што яны б ня вытрымалі канкурэнцыі з тэлеканаламі, дзе працавалі б прафэсіяналы, якія адчуваюць сябе прадстаўнікамі беларускай зямлі і разумеюць, што ў нас час трэба быць інтэлектуаламі.

**Гутарыў Сяргей Будкін**

# Гавал вярнуўся ў драматургію

Чаму страта ўлады азначае для некаторых страту сэнсу жыцьця? Пра гэта новая п'еса экс–прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла.



**Вацлаў Гавал з Дагмар — жонкай і выканаўцай галоўнай ролі — пасьля прэм'еры.**

Стаўшы лідэрам чэскае апазыцыі, падпольля, Вацлаў Гавал працягваў пісаць, а вось калі ў 1989 годзе стаў прэзыдэнтам Чэхіі — перастаў. І цяпер ён вярнуўся ў тэатар. «Сыход» — яго першая п'еса за дваццаць гадоў — была пастаўленая ў праскім тэатры «Archa» 20 траўня.

Чаму страта ўлады азначае для некаторых страту сэнсу жыцьця? Чаму ўлада для некаторых людзей мае такое значэньне, што адлучэньне ад яе значыць руйнаваньне ўсяго іхнага сьвету? Па адыходзе з пасады прэзыдэнт Чэхаславаччыны з 1989 па 1992 г. і Чэскай Рэспублікі з 1993 па 2003 г. меў досыць часу, каб паразважаць над гэтымі пытаньнямі.

«Сыход» — вынік развагаў.

Галоўны герой п'есы Вацлава Гаўла — Рыгер, былы кіраўнік неназванай дзяржавы. Рыгера зьмяніў на пасадзе ягоны намесьнік Кляйн. Атачаны ценявымі бізнэсоўцамі, Кляйн загадвае выгнаць Рыгера з шыкоўнай вілы, павысякаць вішнёвы сад і пабудаваць на яго месцы гандлёвы цэнтар, казіно й бардэль.

Некаторым падаліся спрэчнымі алюзіі на чэхаўскі «Вішнёвы сад» і шэксьпіраўскага «Караля Ліра». Акрамя таго, многія ўбачылі ў асобе Кляйна намёк на былога праціўніка Гаўла — Вацлава Клаўса, новага прэзыдэнта краіны. Аднак сам аўтар ня лічыць, што ягоны пэрсанаж асабліва абавязаны сваім нараджэньнем прэзыдэнцкаму наступніку.

П'еса — пра тое, як цяжка вярнуцца да нармальнага жыцьця чалавеку, які страціў уладу. Вярнуцца да нармальнага жыцьця — ня значыць прызвычаіцца карыстацца звычайным мабільнікам. Задача ў тым, каб знайсьці ўнутраны спакой — нягледзячы на тое, што цябе сьлепяць выбліскі камэраў шматлікіх папарацы.

Чэская крытыка піша, што дзесяцігодзьдзе ва ўладзе пайшло Гаўлу-драматургу на карысьць. Гэта першы твор, які ён ствараў, маючы за плячыма багаты жыцьцёвы досьвед. Раней Вацлаў Гавал пісаў як апанэнт сыстэмы, не мяркуючы, што некалі трапіць ва ўладу.

«Сыход» — п'еса, створаная ўжо пасьля таго, як ён гэтую сыстэму прайшоў наскрозь. Нягледзячы на гады прэзыдэнцтва, Вацлаў Гавал захаваў здольнасьць да самарэфлексіі й не вагаўся ў «Сыходзе» нават перад самапародыяй.

Прэм'ера сабрала шмат гледачоў. У 71 год Гаўлу ёсьць чым заняцца, акрамя справаў урадовых.

**Антон Тарас**

# Фолк-кароль зь піцерскай прапіскай



«Як у вас тут халодна!» — першае, што сказаў, сыходзячы зь львоўскага цягніка, Андрусь Палаўчэня. Ва Ўкраіне лідэр фолк-каралёў мінулага году быў на адпачынку, але яго тэрмінова выклікалі ў Менск. Гурт OSIMIRA разам зь «Ляпісам Трубяцкім» запрасілі на «карпаратыўнік» у Сілічах. Андрусь у беларускай сталіцы бывае вельмі рэдка, пераважную частку часу ён праводзіць у Расеі і Польшчы. Жыве ў Санкт-Пецярбургу. Тут ён пазнаёміўся з будучай жонкай на сваім канцэрце і вырашыў застацца. Грошы зарабляе прадусаваньнем канцэртаў у Польшчы — фэстываль WEGORAPA ў Вэнгажэве і вялікі культурніцкі форум Mediawave (ладзіцца ў пяці эўрапейскіх краінах) — ягоныя асноўныя дзялянкі. Нарадзіўся Андрусь у Магілёве ды мае спэцыяльнасьці, далёкія ад шоў-бізу, — фэльчар і масажыст. Кажа, калі трэба падзарабіць, то вяртаецца да майстэрства масажу.

Лідэр OSIMIRA мог зрабіць неблагую кар'еру тэлевядоўцы. Сэрыю праграмаў Палаўчэні «Ключы ад гораду» дагэтуль паўтараюць у этэры магілёўскага тэлебачаньня, дзе ён працаваў тры гады, а летась нават атрымаў прыз «Тэлевяршыня» як найлепшы рэгіянальны тэлежурналіст. Андруся запрасілі на Першы канал, але якраз у гэты час адбыўся той самы піцерскі канцэрт гурту, які зьмяніў ягоны лёс.

Астатнія музыкі OSIMIRA таксама жывуць не ў адным горадзе — частка ў Магілёве, астатняя ў Віцебску. «800 кілямэтраў — адлеглась зусім невялікая і нашай агульнай справе не перашкаджае», — кажа Андрусь, які езьдзіць на рэпэтыцыі ў родны горад на начным цягніку зь Піцеру.

У музычных колах стаўленьне да OSIMIRA неадназначнае. «Яны адпрацоўваюць грошы па замежжах і душы ў музыку не ўкладаюць», — даводзілася нават такое пра іх чуць. Андрусь апанэнтам адказвае з усьмешкай: «Самае галоўнае, што мы атрымліваем задавальненьне ад працы з старымі беларускімі сьпевамі. І што кепскага, калі гэтая праца мае камэрцыйны посьпех?» Андрусь кажа, што сьпеўны матэрыял яны шукаюць самі. 16 чэрвеня музыкі зьбіраюцца ў чарговую экспэдыцыю — у Бялыніцкім раёне яны хочуць запісаць у бабулек песьні, што здавён выконваліся на Тройцу.

«Мне яшчэ даводзілася чуць, што наша музыка не адпавядае ўсталяваным фолк-канонам. Але мы ня граем фолк, мы працуем у плыні этна-музыкі — паняцьці больш шырокім, — разважае музыка і праз хвіліну дадае: — Але мы ўсьведамляем, што нашы аранжыроўкі народных песень зробленыя з пункту гледжаньня гарадзкіх жыхароў. Каб выконваць фолк сапраўдны, трэба нарадзіцца і жыць у вёсцы». На думку Андруся, да сапраўднага фолк-гучаньня найбольш наблізіліся два беларускі гурты — Guda і ESSA.

Музыку OSIMIRA няпроста клясыфікаваць. Апошні іх альбом Druva, выдадзены ў Маскве, істотна розьніцца ад таго, што яны выконваюць на канцэртах. «Восі» тут на час пазбыліся характэрнага для сваіх жывых шоў драйву ды запісалі спакойны дыск архаічных сьпеваў.

Канцэрты іх сапраўды трэба бачыць. Кожны, хто прысутнічае на сцэне, адпрацоўвае напоўніцу і зараджае напросту неймавернай энэргіяй. Музыкі сьцьвярджаюць, што ў іх падыход да кожнага слухача індывідуальны. На адным з сольных канцэртаў у Маскве яны сымбалічна частавалі кожнага наведніка кілішкам крамбамбулі ды дранікамі ўласнага прыгатаваньня.

На апошняй «Рок-Каранацыі» Андрусь Палаўчэня атрымаў фолк-карону з рук Алега Хаменкі ды сказаў лідэру «Палацу»: «Дзякуй, тата!». «Я сапраўды лічу Алега хросным бацькам нашага гурту. Калі мы толькі пачыналі з «Акругай вольнага мастацтва», то проста марылі выйсьці на адну сцэну з такімі гуртамі, як «Палац» і «Тройца». Мы на іх расьлі, ім прыпадабняліся і вучыліся ня толькі музычнага майстэрства, але і стаўленьня да гледача».

Можна ўжо сказаць пэўна, што OSIMIRA сваю мару зьдзейсьнілі — 26 траўня ў Летнім амфітэатры Віцебску яны выступілі ў вялікім фолк-шоў разам з «Тройцай» ды «Палацам».

**Сяргей Будкін**

# Сацыяльнасьць і дакумэнталізм у Канах

25 траўня былі абвешчаныя пераможцы 61-га Канскага кінафэсту. «Залатую пальмавую галіну» атрымала француская стужка Лярана Кантэ «Між мурамі» («Кляса»). Гэта карціна пра складаныя стасункі школьнікаў з гарадзкіх ускраін і іхнага настаўніка. «Мы хацелі зрабіць фільм пра сучаснае француская грамадзтва», — сказаў рэжысэр, калі атрымліваў узнагароду. Акторамі сацыяльнай драмы «Кляса» сталіся звычайныя падлеткі зь бедных парыскіх кварталаў.

Італьянская карціна Матэа Гаронэ «Каморра», якая атрымала Гран-пры, таксама вылучаецца сучаснай сацыяльнай праблематыкай. Фільм гаворыць пра карупцыю і мафію, якая інсьпіравала Нэапальскі сьмецьцевы крызіс. Прэміяй журы адзначаная й італьянская стужка «Зорка». Паола Сарэнціна зрабіў сатырычны фільм пра эпоху прэм'ера Джуліё Андрэоці, які патураў мафіі.

«Залатую камэру» за найлепшы дэбют аддалі брытанскаму рэжысэру Стывэну МакКуіну. Ягоная стужка «Голад» распавядае пра галадоўку зьняволенага байца Ірляндзкай Рэспубліканскай арміі, што завершылася сьмерцю.

На фэстывальным экране зноў — Чэ Гевара ў карціне зь ляканічнаю назвай «Чэ».

Чатырохчасовая біяграфія рэвалюцыянэра, зьнятая Стывэнам Содэрбэргам, прынесла Бэнісіё Дэль Тора прыз за найлепшую мужчынскую ролю. Але Дэль Тора сказаў, што ўзнагарода належыць самому рэвалюцыянэру.

На фэсьце аддавалі перавагу «люм'ераўскаму» кірунку — гэта значыць, фільмам пра рэальнасьць, якія грунтуюцца на дакумэнтальнай праўдзе. Шчэ адна біяграфічная карціна «Тайсан» Джэймса Тобака (прыз «Накаўт») зьнятая пад дакумэнтальны раман; а расейскі дакумэнталіст-клясык Сяргей Дварцавы, які дэбютаваў у ігравым кіно, павёў дадому ўзнагароду «Адмысловага позірку» за мэдытатыўную казахстанскую стужку «Тульпан».

**Андрэй Расінскі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Тодар Копша: «Мяне цікавіць вечнасьць»

Мастак Тодар Копша піша карціны ў абстракцыянісцкай манеры. Ягоныя палотны пабудаваныя на колерных асацыяцыях, у іх прэвалюе своеасаблівае ўспрыняцьце формы, праз якую ён імкнецца зразумець сутнасьць. «Трансмутацыі і мэтамарфозы матэрыі немагчыма перадаць сродкамі толькі традыцыйнага мастацтва. Паўторы, кантрасты, колерныя экспэрымэнты — тое, што раней называлі фарматворчасьцю — навая азбука, новая мова мастацтва, якія павінны жыць і разьвівацца. Мастак — гэта дыктатар. Ён толькі творыць, ён дыктуе, а тлумачэньню гэта не падлягае».

Адкуль такі псэўданім? Па-старабеларуску копша — магільны дух, далакоп. Яго прыдумаў для сябра Алесь Разанаў. Здаецца, такі псэўданім перадае цікавасьць мастака да цяжкіх тэм эсхаталягічнай весткі, канца сьвету, канца жыцьця. «Мяне не цікавіць палітыка, мяне цікавіць філязофія. Філязофія — гэта нават не жыцьцё, гэта ўжо нешта вышэйшае за жыцьцё», — кажа ён.

У апошнія гады Копша захапіўся каляжамі. У гэтым жанры ў Беларусі працуюць нямногія. «Мяне цікавіць мастацтва рэжысуры, і каляжы дазваляюць мне рэалізаваць гэтую маю цікавасьць. Мне цікава з фрагмэнтаў, абрыўкаў, нейкіх ужо выкарыстаных рэчаў стварыць новы кантэкст. Зрабіць з дробных рэчаў новы цэльны твор — гэта вельмі цікава і складана».

Тодар Копша вось ужо доўгі час не выходзіць з дому: праз хваробу ў яго паралізаваныя ногі і ён ня можа хадзіць. Але карціны яго ходзяць: некалькі зь іх я пабачыла на выставе ў сядзібе БНФ і была ўражаная трагічнасьцю і напружаненьнем, якія выпраменьвалі халсты. «Стабільнасьць, сымэтрыя — гэта не заўсёды добра, толькі зь няўстойлівасьці, абрыву, драмы разьвіваецца нешта новае», — кажа сп.Копша.

Мастак марыць аб тым, каб выдаць каталёг, куды ўвайшлі б ягоныя найлепшыя работы.

**НБ**

## СЬЦІСЛА

### Сьвята мастацтваў у Міры

пройдзе 31 траўня. Старажытная музыка стане гвэздом праграмы. Асобную праграму прывязе аркестар Міхаіла Фінберга.

### Арганізатары Be2gether дамовіліся з Fool's Garden і ня здолелі — з N.R.M.

Адкрыццё рок-фэсту Be2gether'2008 урачыста пройдзе 14 жніўня каля Віленскай ратушы. 15 жніўня фэст перамесьціцца ў Нарвілішкі — вёску ля мяжы зь Беларусьсю. Ля старога замку музыка будзе гучаць да 17 жніўня. Зайграюць 70 гуртоў. Зь Беларусі ўдзел бяруць OSIMIRA і Mauzer. Плянавалі запрасіць і N.R.M., аднак арганізатары ня здолелі дамовіцца з музыкамі. «За тыя грошы, што нам прапанавалі, мы ня граем ужо год дзесяць», — сказаў Піт Паўлаў. Квіток на Be2gether будзе каштаваць 65 эўра.

### Да 2011 году адновяць дом Багдановіча

На фундамэнтах дому, дзе нарадзіўся паэт, цяпер стаіць іншы будынак. Паводле словаў дырэктара Літаратурнага музэю Максіма Багдановіча Тацяны Шаляговіч, праект аднаўленьня дому паэта быў распрацаваны яшчэ да 100-годзьдзя з дня нараджэньня паэта. На першым паверсе прапануецца адкрыць школу ці цэнтар дзіцячай творчасьці, а на другім — аднавіць абстаноўку менскай інтэлігенцыі канца XIX — пачатку XX ст.

**Паводле БелаПАН, «Тузін гітоў»**

# Верхняму гораду пагражае спрэчка сылюэтаў

Піша архітэктар **Ігар Байцоў**.

У апошні час у СМІ раз-пораз зьяўляюцца зьвесткі пра запляніраванае будаўніцтва ў Менску вельмі высокага 5-зоркавага гатэля — каля 35 паверхаў — побач з музэем Вялікай Айчынай вайны і домам Ваньковічаў. Пляцоўка, выбраная для пабудовы, знаходзіцца пры самай мяжы гістарычнага цэнтру, у яго ахоўнай зоне, дзе павінны існаваць жорсткія абмежаваньні вышыні. Конкурсу праектаў і іх грамадзкага абмеркаваньня не было. Якія ж будуць наступствы зьяўленьня гэтага навабуду?

Апублікаваныя ў друку ілюстрацыі да праектнай прапановы даюць магчымасьць выявіць прыблізна, як будзе суіснаваць гэты высотны гатэль з гістарычным ансамблем цэнтру Менску. Карыстаючыся плянам забудовы і зыходзячы з розьніцы вышынь Палацу рэспублікі і праектаванага гатэлю, няцяжка вызначыць у агульных рысах, якое месца можа заняць гэты 35-павярховік у панараме Верхняга гораду, у яго сылюэце. Яго спрошчаныя сылюэтныя выявы, умантаваныя ў натурныя фатаздымкі, дапамагаюць уявіць, што адбудзецца. З многіх кірункаў гэтая сучасная вэртыкаль будзе прысутнічаць у полі бачаньня гледачоў, узвышацца над гістарычнымі будынкамі, зацята спрачацца сваім абліччам з далікатнымі, вытанчанымі вэртыкалямі храмавых званіц. Такое «ўзбагачэньне сылюэту» прынясе вялікую шкоду — у гістарычнай частцы 940-гадовага гораду, сталіцы краіны, не застанецца ніводнага «неасучасьненага» фрагмэнту гарадзкога ляндшафту. Яшчэ з 1960-х, з пабудовы «Белпрампраекту», ідзе загрувашчваньне сылюэту Верхняга гораду дадаткамі, якія яго скажаюць. Цяпер рэшткі гістарычнай аўры Старога Менску зьнікнуць канчаткова.

Калі ставіцца з належнай павагай да таго, што яшчэ засталося ад каштоўнай менскай мінуўшчыны, згаданая пабудова павінна быць ці не ўдвая ніжэй, чым цяпер плянуюць. Дарэчы, велічэзныя яе памеры не запатрабаваная і кампазыцыяй забудовы Кастрычніцкай плошчы. Каб пазьбегнуць сур'ёзнай горадабудаўнічай памылкі, дапушчальная вышыня гатэлю павінна дакладна вызначацца з выкарыстаньнем кампутарнай мадэлі Верхняга гораду. У дадзеным выпадку бізнэс-інтарэсы ня могуць быць самым вызначальным фактарам.



Галоўная мастацкая каштоўнасьць Верхняга гораду — ня нейкая колькасьць старасьвецкіх пабудоваў паасобку, саміх па сабе, бо падобныя да іх ёсьць і ў іншых месцах. Галоўнае — гэта вельмі выразнае, маляўнічае і непаўторнае спалучэньне рэльефу, забудовы і вулічак, што зьбягаюцца да плошчы зь яе храмамі, якія ўвенчваюць панараму. Трэба імкнуцца да таго, каб гістарычная частка максымальна выявіла свой патэнцыял выразнасьці, каб іншыя складнікі гарадзкой забудовы не заміналі ёй, каб кожны ансамбль сваім асаблівым выглядам прыносіў найбольшую карысьць адзінаму ўнікальнаму гісторыка-архітэктурнаму вобразу гораду, у якім знойдуць годнае месца і Стары Менск, і «Горад Сонца» Артура Клінава, і сучасныя ансамблі.

Ёсьць чаму павучыцца ў нашых папярэднікаў. Як многа прыгажосьці можа прынесьці нават сьціплы будынак, калі ён ствараецца на сваім месцы, згодна з маштабам, кампазыцыяй і характарам забудовы! Яскравы прыклад таму — флігель дому Ваньковічаў, што цяпер узнаўляюць. Будаўніцтва яшчэ не завершана, а ўжо прыгожа, усё навакольле цудоўна пераўтвараецца! Паглядзіш — і сэрца радуецца, і ня хочацца верыць, што неўзабаве зусім побач можа вырасьці непамерна вялікае збудаваньне!

# Спаленыя імпэрыяй

21 траўня — Дзень генацыду чаркескага народу царскай Расеяй. Народу, які пакінуў сьляды і ў гісторыі Беларусі. Піша **Сяргей Богдан**.

21 траўня 1864 году, калі апошнія каліноўцы прабіраліся зь Беларусі ў бясьпечную Галіччыну, на месцы будучага гораду Сочы адбыўся апошні няроўны бой чаркескага аддзелу з расейскімі войскамі. Ім скончылася 30-гадовая вайна Расеі на Каўказе. У выніку яе з паўтарамільённай, наймацнейшай народнасьці рэгіёну чаркесы ператварыліся ў купку разрозьненых плямёнаў, разрэзаных расейскімі пасяленьнямі на маленькія анклявы.

### Каўкаскія ваяры гетмана Астроскага

Сьляды колішняе славы чаркесаў можна адшукаць ня толькі сярод каўкаскіх скеляў, але і ў гісторыі Беларусі. У ёй чаркесы прысутнічалі цягам стагодзьдзяў.

Можна меркаваць, што першыя чаркесы трапілі ў наш край зь іншымі перасяленцамі з Усходу, якіх (памылкова) прынята зваць толькі татарамі. Тых з XIV ст. запрашалі вялікія князі як ваенных спэцыялістаў. Чаркесы ў старабеларускай мове называліся пяцігорцамі, ад «Пяцігор'я» — вобласьці Каўказу паміж Церакам і Кубаньню (цяперашнія Кабардына-Балкарыя, Карачаева-Чаркесія і часткова Стаўрапольскі край). Чаркесаў было няшмат, але дзякуючы ваеннай тэхналёгіі яны мелі значны ўплыў.

Дзякуючы ім у войску ВКЛ зьявілася надзвычай эфэктыўная лёгкая пяцігорская кавалерыя, што амаль ня мела брані, але валодала адмысловымі дзідамі. Пазьней яна ўтваралася ўжо і з тутэйшых татараў ды іншай шляхты, але самая ідэя мела каўкаскае паходжаньне. Хлопцы-пяцігорцы згадваюцца і ў вядомай песьні пра пераможную Аршанскую бітву з маскоўскім войскам:

> А ў нядзельку параненьку
> Сталі хлопцы-пяцігорцы,
> Каля рэчкі на прыгорцы...

У 1550—1560-х адна з чаркескіх абласьцей — Кабарда — трапляе ў залежнасьць ад Масквы. Ратуючыся ад Івана Жахлівага, у 1562 г. пяць кабардынскіх князёў уцякаюць з Каўказу ў Рэч Паспалітую, разам зь сем'ямі і ваярамі. Маскоўскі тыран паспрабаваў вярнуць іх, але пяцігорцы, сустрэўшы добры прыём у караля, засталіся. Бальшыня іх была праваслаўнымі, толькі некаторыя паганцамі. Пазьней нашчадкі ваяроў застануцца праваслаўнымі, а князі стануць каталікамі. Асабліва вызначыцца гераізмам пяцігорскі князь-перасяленец Цемрук, што камандаваў пяцігорскімі харугвамі ў войску Рэчы Паспалітай. Калі 13 красавіка 1572 г. магутнае турэцкае войска атакавала сілы Рэчы Паспалітай у Малдове, усе войскі Рэчы Паспалітай уцяклі з поля, і толькі Цемрукова пяцігорская харугва засталася і ваявала, пакуль іншыя не ачомаліся і не вярнуліся, каб спыніць туркаў.

Культурнае ўзаемадзеяньне паміж чаркесамі і Рэччу Паспалітай было даволі рэгулярным. Польскі гісторык Б.Бараноўскі ў кнізе «Расея, Польшча і Прычарнамор'е ў XV—XVIII ст.» піша, што вопратка паслоў Рэчы Паспалітай у XVII ст. нічым не адрозьнівалася ад грузінскай ці чаркескай. Кароль Ян Сабескі апранаўся зазвычай у каўкаскую вопратку. Сёдлы і конская збруя таксама вырабляліся водле чаркескай ці грузінскай моды. Нават у XVII ст., нагадвае Бараноўскі, на службе Рэчы Паспалітай знаходзілася «шмат чаркесаў і іншых горцаў Каўказу, якіх звычайна таксама называлі чаркесамі, пяцігорцамі, людзьмі з Бэштаў» [гэта сынонімы кабардынцаў — усходніх чаркесаў]. «Іх заслугі былі вялікія ў барацьбе з туркамі і татарамі, і асабліва з швэдамі. Пра ўплыў чаркескага вайсковага майстэрства на Рэч Паспалітую можа казаць тое, прыкладам, што ў літоўскім войску XVII ст. былі шматлікімі аддзелы пяцігорскай кавалерыі. Меліся таксама ўзброеныя, а часткова і апранутыя на чаркескі капыл аддзелы, у якіх служылі палякі, беларусы, украінцы і ліцьвіны».

Таму часам цяжка зразумець з крыніцаў, ці ідзецца пра сапраўдных чаркесаў, ці пра тутэйшых жыхароў у чаркескіх палках. Пяцігорцы другога тыпу (то бок тутэйшыя) згадваюцца і сярод удзельнікаў паходу на Маскву ў 1612 г., побач зь лісоўчыкамі.

### Паўстаньні — ад Беларусі да Каўказу

Пазьней пяцігорскімі пачалі называць і панцырныя харугвы.



**Так маглі выглядаць пяцігорцы, што служылі ў войсках ВКЛ. На фота пачатку XX ст.: чаркесы ў старадаўнім баявым убраньні.**

Пасьля вайсковай рэформы 1776 г. пяцігорскія харугвы былі пераўтвораныя ў 2-ю Пяцігорскую брыгаду нацыянальнай кавалерыі ВКЛ (вядомую як Пінская, бо зьмяшчалася ў Пінску і ваколіцах). Брыгада гераічна ваявала ў апошнія гады Рэчы Паспалітай і брала ўдзел у бітве пад Мірам, абароне Вільні, варшаўскага прадмесьця Прагі ды бітве пад Мацэёвіцамі. З краінай загінула каўкаская традыцыя войскаў ВКЛ.

У XIX ст. выгнанцы зь зямлі былое Рэчы Паспалітай шукалі паратунку пасьля няўдалых антырасейскіх паўстаньняў у Брытаніі, якая, у сваю чаргу, у 1830-х спрабавала пры дапамозе туркаў і саюзных ім чаркесаў адстаяць свае інтарэсы ў супрацьстаяньні зь Пецярбургам. Эміграцыйнае атачэньне князя Адама Чартарыйскага ў гатэлі Lambert з імпэтам імкнулася наладзіць супрацу з каўкаскімі народамі, але місія Людвіка Зьвяркоўскага і Казімера Гардона ў Чаркесію ў 1844 г. праваліласа.

Толькі на зыходзе Крымскай вайны Францыі і Брытаніі з Расеяй з брытанскай падтрымкай удалося сфармаваць з добраахвотнікаў і дэзэртэраў з расейскага войска аддзел артылерыі (6 гарматаў) лікам 120 асобаў пад камандаваньнем Тэафіла Лапінскага. У лютым 1857 г. аддзел высадзіўся з брытанскага параплава ў раёне Геленджыку і заснаваў умацаваную базу, вакол якой пачалі зьбірацца аддзелы чаркесаў. Але ўжо 20 чэрвеня расейскія войскі выбіваюць Лапінскага з базы. Ён адступае з аддзелам у горы, дзе вае яшчэ год.

Гісторыя экспэдыцыі Лапінскага была нядоўгай і няўдалай, бо чаркескае і дагестанскае супраціўленьне дажывалі апошнія месяцы. Высланая Вітальдам Чартарыйскім падчас паўстаньня 1863 г. на Каўказ вайсковая група палкоўніка Клеменса Праўлоцкага ўня мела шанцаў падбухторыць каўказцаў на новае паўстаньне супраць Расеі. Яна высадзілася ў Чаркесіі ў верасьні 1863 г. і дзейнічала да сакавіка 1864-га.

* * *

Чаркесы заплацілі тады найвялікшую цану за супраціў каланізатарам — іх выбілі ці зmусілі да забойчай дэпартацыі амаль цалкам. Гэта быў першы такога кшталту генацыд — арганізаванае вынішчэньне народу як такога — у сучаснай гісторыі сьвету. Чаркесы дагэтуль змагаюцца за выжываньне, а злачынства супраць іх забытае. Наколькі? Нікому ня прыйдзе да галавы ладзіць Алімпіяду ў Асьвенцыме, але ў Сочы і Краснай Паляне, будуючы стадыёны на магілах, — калі ласка. Ці памятае хто пра чаркесаў?



**КРАН УПАЎ НА КАСЬЦЁЛ**
**24 траўня ў Салігорску на будаўніцтве лядовага палацу ўпаў вежавы кран. Стралой крана пашкоджаны дах касьцёла побач з будоўляй. Службы ў храме пакуль прыпыненыя.**

## Жудасная аварыя ў залеву

24 траўня на 62-м кілямэтры дарогі Менск—Віцебск, ля крутой павароткі на Плешчаніцы легкавая машына «Фольксваген» сутыкнулася з грузавіком MAN. За рулём легкавіка быў 19-гадовы мянчук, у салёне — яшчэ тры пасажыры. Дарога была мокрай, ішоў моцны дождж. Грузавік працягнуў машыну сто мэтраў і скінуў пад адхон. Машыну скамечыла так, што спатрэбілася яе разразаць, каб дастаць целы загінулых. «Фольксваген», які кіраваўся ў Полацак, далей па трасе, каля Бегам’я, чакалі сваякі. Калі маўчаньне мабільнага тэлефона зацягнулася, яны паехалі насустрач… Кіроўца грузавіка сур’ёзна не пацярпеў.

## Загінуў пад асфальтам

Супрацоўнікі ДАІ высьвятляюць, чаму абярнуўся МАЗ, нагружаны асфальтам, у Шклоўскім раёне. У выніку сутыкненьня МАЗу і іншамаркі асфальт высыпаўся на апошнюю, кіроўца яе загінуў.

## Распродаж «Ісьлачы»

Адкрыты аўкцыён па продажы дому творчасьці «Ісьлач» перанесены на 10 чэрвеня. На продаж выстаўляюцца галоўны корпус Дому пісьменьнікаў, жылыя, гаспадарчыя й службовыя будынкі, фінская лазьня, драўлянае КПП, помпавая станцыя, інжынэрныя сеткі, дарожныя пакрыцьці, малыя архітэктурныя формы, цяпліца… Дом творчасьці знаходзіцца ў Валожынскім раёне каля мястэчка Ракаў, на беразе ракі Ісьлач, на ўчастку плошчай 18 га.

Пачаткова кожны лот аўкцыёну ацэньваецца на мільён амэрыканскіх даляраў. Летась, адабраўшы ў Саюзу беларускіх пісьменьнікаў памяшканьне, судовыя інстанцыі ўзяліся й за ГА «Беллітфонд».

ГА «Беллітфонд» — спадкаемца Літфонду СССР, заснаванага на базе Літаратурнага фонду, статут якога пісаў яшчэ Леў Талстой. Як паведамлялі СМІ, для прыняцьця рашэньня пра ліквідацыю аб’яднаньня, судзьдзі Вярхоўнага суду Валер’ю Самалюку спатрэбілася 10 хвілін.

## Прыгажуні будуць рэгуляваць рух

Падчас фэстывалю «Славянскі базар у Віцебску» ў якасьці рэгуліроўшчыц руху выставяць прыгожых дзяўчат. Праводзіцца «кастынг» сярод супрацоўніц ДАІ. У парадным адзеньні дзяўчаты-міліцыянэркі будуць выглядаць вельмі эфэктна. Мужчынам-кіроўцам будзе прыемна ня толькі на прыгажунь паглядзець, а нават і штраф заплаціць.

## Конкурс ды-джэяў у Старых Дарогах

У жніўні ў Старых Дарогах правядуць другі Менскі абласны конкурс ды-джэяў. Як гаворыцца ў паведамленьні Менаблвыканкаму, сёньняшнія ды-джэі выступаюць у адным аблічны псыхолягамі, шоўмэнамі, гукарэжысэрамі, прадусарамі й арт-мэнэджарамі. Пры дапамозе конкурсаў-аглядаў спэцыялісты ўпраўленьня плянуюць «зьмяніць створаны ў грамадзтве асацыяльны «партрэт» дыскатэкі й надаць ёй высакароднае «аблічча».

## Беларус заправіў машыну мабільнікамі

У пункце пропуску «Бераставіца» падчас афармленьня легкавога аўтамабіля «Мэрсэдэс», які праходзіў па «зялёным» канале», мытнікамі ў паліўным баку быў выяўлены схаваны ад нагляду тавар. 129 мабільных тэлефонаў на агульную суму 40 млн рублёў грамадзянін Беларусі спрабаваў незаконна ўвезьці з Польшчы. Аўтамабіль і кантрабанда перададзеныя ў Гарадзенскую мытню.

## Хэнлан вяртаецца

Канадзкі трэнэр зноў узначаліць нацыянальную зборную Беларусі. Зь імем Глена Хэнлана зьвязаны найлепшы посьпех айчыннай дружыны на чэмпіянатах сьвету: у 2006 г. у Рызе беларусы былі шостымі. Пасьля гэтага Хэнлан пакінуў пасаду трэнэра зборнай Беларусі, цалкам сканцэнтраваўшыся на працы ў «Вашынгтон Кэпіталз», парэкамэндаваўшы на сваё месца Курта Фрэйзэра. Зараз ён зноў зойме пасаду галоўнага трэнэра і будзе сумяшчаць кіраўніцтва ёю і фінляндзкім клюбам «Ёкерыт».

## Глеб больш не гулец «Арсэналу»

Ён зразумеў, што прыйшоў той момант, калі трэба нешта мяняць. Аляксандар правёў у «Арсэнале» тры добрыя сэзоны, і ён задумаўся, зможа ці паказваць той узровень футболу, які паказвае цяпер, паведамляе агент футбаліста. Яшчэ не вядома, у які клюб пяройдзе Глеб. Апроч «Інтэру», разглядаецца варыянт з «Барсэлёнай», «Мілянам», мадрыдзкім «Рэалам».

## Грузавы самалёт разьбіўся ў аэрапорце Брусэлю

Боінг-747 зьехаў з узьлётна-пасадачнай паласы пры спробе ўзьлёту й разваліўся на часткі. На борце знаходзіліся 5 чалавек, чацьвёра атрымалі пашкоджаньні. Пілёт самалёту паведаміў, што падчас узьлёту ён пачуў моцны пабочны шум. Самалёт удалося спыніць пры канцы паласы, побач з дамамі й могілкамі.

## Усе дарогі вядуць у Каралявец...

Узнаўляюцца авіярэйсы з Магілёва. З 29 траўня жыхары Маігілёўшчыны змогуць даляцець у Каралявец. Рэйсы будуць рабіцца ў чацьвяргі самалётам АН-24. Магілёўскі аэрапорт ня бачыў пасажырскіх рэйсаў ужо дваццаць гадоў. Сёлета авіярэйсы ў Каралявец сталі ажыцьцяўляць і зь віцебскага аэрапорту.

## На ўскраіне Барысава знайшлі пахаваньне 1812 году

Як сьцьвярджаюць гісторыкі, у часе знакамітай пераправы церазь Бярэзіну і падчас баёў у Барысаве ў 1812 годзе агульныя страты напалеонаўскага войска складалі дзясяткі тысяч чалавек. Нямала ў тых баях палегла й салдат расейскага войска. Аднак за мінулыя два стагодзьдзі не было знойдзена ніводнай магілы, якая б адносілася да таго пэрыяду.

На паўночнай ускраіне Барысава, на тэрыторыі санаторыя «Бярэзіна», воінамі 52-га пошукавага батальёну было адкрытае масавае пахаваньне, як мяркуецца, 1812 году. Па спадарожных знаходках — гузіках ад мундураў і кулі крэмневай стрэльбы — можна зрабіць папярэднюю выснову, што гэта брацкая магіла салдатаў арміі Напалеона.

Раскопкі ініцыяваў жыхар Барысава Вячаслаў Клімковіч. У дзяцінстве ён стаў сьведкам таго, як падчас пабудовы санаторыя экскаватар выкуліў зямлю з чалавечымі касьцямі.

## «Фаэтон» шле ўнікальныя здымкі зь недасьледаванай часткі Марсу

На Зямлю прыйшлі першыя здымкі паверхні Марсу, зробленыя з дапамогай амэрыканскага касьмічнага апарату «Фаэтон», які ў нядзелю пасьпяхова прызямліўся на чырвоную плянэту пасьля дзесяці месяцаў палёту. Галоўная задача экспэдыцыі — дасьледаваць склад ледзянога слою на паўночным полюсе Марсу і выявіць, ці ёсьць там якія-небудзь арганічныя рэчывы.

**Паводле «Звязда», БелаПАН, horki.inf, «Прессбол», borisov-e.info, радыё «Свобода»**

## Вялікі Брат з даху будынку Белсаўпрафу лечыць вочы

Чаго толькі ні пераўжыў пралетарыят на даху менскага Палацу прафсаюзаў за апошні час! Будынак, вядомы беларусам па 500-рублёвай купюры, быў сьведкам гістарычных падзеяў: інаўгурацый Лукашэнкі й разгону «Плошчы» ў 2006.

Нядаўна ля скульптурнай кампазыцыі (той, што на купюры зьлева) зьявілася камэра на трынозе, пасьля чаго некаторыя госьці сталіцы памылкова прымалі кампазыцыю за помнік кінэматаграфістам. Але празь некаторы час высьветлілася, што камэра яшчэ й рухаецца…

І вось, вока Вялікага брата зьнікла разам са скульптурнымі групамі. Рэстаўрацыю скульптураў ад красавіка праводзіць УП «Менскрэстаўрацыя».

Кажуць, празь некалькі месяцаў абноўленыя скульптуры вернуцца на свае гістарычныя месцы. Напэўна, за гэты час камэры ім умантуюць у вочы — каб ня гэтак заўважна было.

**Антон Тарас**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## ІМПРЭЗА

**Сустрэча з Уладзімерам Някляевым**

**4 чэрвеня** на Сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) адбудзецца сустрэча з паэтам Уладзімерам Някляевым. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Польскі плякат XXI ст.**

**У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47) да 16 чэрвеня** працуе выстава «Польскі плякат XXI стагодзьдзя ў асяродзьдзі Галерэі плякату Кшыштафа Дыда ў Кракаве». На выставе прадстаўленыя больш чым 70 плякатаў 20 аўтараў.

**Акварэлі Рыты Цімохавай**

**Тамсама да 20 чэрвеня** працуе выстава акварэляў Рыты Цімохавай. Гатычныя паненкі, жанчыны-блазны зь сярэднявечных балаганаў, тлустыя каты і невялічкія птушкі… У экспазыцыі 30 акварэляў і некалькі ілюстрацыяў.

**Кітайская вышыўка**

**У Гістарычным музэі (вул.Маркса, 12) да 8 чэрвеня** працуе выстава «Сучасная кітайская вышыўка і інтэр'ер».

**Графіка: ад Аўстрыі да Кубы**

**У Нацыянальнай бібліятэцы да 5 чэрвеня** працуе першая міжнародная выстава графікі «Арт-лінія» з удзелам творцаў з Расеі, Украіны, Латвіі, Літвы, Сэрбіі, Аўстрыіі, Польшчы, Кубы, Эстоніі.

## КАНЦЭРТЫ




**Neuro Dubel**

**3 чэрвеня а 20-й у «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — Neuro Dubel. Т.: (029) 671-58-65, (029) 254-49-09

**Закрыцьцё сэзону ў «Зебры»**

**31 траўня ў віцебскім клюбе «Зебра»** — фэст-закрыцьцё канцэртнага сэзону 2007–2008. Хэдляйнэры дзённага аддзяленьня **(пачатак 12:30)** — гурт **«Фляўс і Кляйнн»**. Хэдляйнэры вечаровага аддзяленьня: **Mauzer**, **«Глюкі»**. Таксама граюць: **«Алмазны фронт»**, **«Восьмы дзень»**, **Shit Happens** і іншыя. Квіткі: 6000—20000 руб. Інфармацыя праз т.: (029) 718-72-79, (029) 323-98-46.

**Dali**

**1 чэрвеня ў клюбе «Гудвін» (пр.Незалежнасьці, 19)** гурт Dali прэзэнтуе праграму «Сонца без штаноў». **Пачатак у 19.00.** Замова квіткоў: (029) 254-49-09.

**Купальскае кола**

**20 чэрвеня ў Менску** пройдзе фольк-фэст «Купальскае кола». Удзел бяруць **ZNICH**, **LITVINTROLL**, **NASOFERUS**, **ДЗЯДЫ** (Беларусь), **OBTEST** (Літва). **Клюб «Рэактар» (вул.Харужай, 29).** Квіткі: ад 18 000 да 27 000 руб. Даведкі па т.: (029) 649-08-88.






## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**30 (пт)** — «Памінальная малітва»
**31 (сб)** — «Ідылія»
**1 (ндз)** — «Слуга двух гаспадароў»
**3 (аўт)** — «Камэдыя»
**8 (ндз)** — «Паўлінка»

*ранішнія спэктаклі*
**5 (чц)** — «Адчыніце Кантралёру!»
**8 (ндз)** — «Маці»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**30 (пт)** — «Адвечная песьня»
**31 (сб)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»






## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Індыяна Джонз баразны не псуе

**Індыяна Джонз і Каралеўства Крышталёвага Чэрапу** (Indiana Jones and the Kingdom of the Crystal Skull)

ЗША, 2008, каляровы, 124 хв.

**Рэжысэр:** Стывэн Сьпілбэрг

**Ролі выконваюць:** Гарысан Форд, Кэйт Бланшэт, Карэн Алэн, Шая ЛаБаф, Рэй Ўінстан, Джон Гёрт

**Жанр:** Прыгоды

**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Археоляг Індыяна Джонз адпраўляецца ў амазонскія джунглі на пошукі крышталёвага чэрапа — а заадно знаходзіць жонку й сына. Героям перашкаджае гарная ўкраінская камуністка (Кэйт Бланшэт) з эсэсаўскімі звычкамі і гэбоўскай арміяй…

20 гадоў таму трылёгія пра Індыяну Джонза, прыдуманая Сьпілбэргам і Лукасам, увайшла ў скарбонку кінэматографу і сталася недасягальным узорам для прыгодніцкіх стужак. Знакаміты археоляг быў героем і ўдалага тэлевізійнага цыклю, дзе паказваліся прыгоды юнага Індыяны. А актор Гарысан Форд, які стварыў вобраз амэрыканскага прафэсара-авантурніка зь фірмовым бізуном і каўбойскім капелюшом, пасьля трылёгіі зрабіўся міліярдэрам.

Індыяна вярнуўся, хаця й пастарэў разам з намі. Але ў 1957 годзе ён усё яшчэ ў выдатнай прыгодніцкай форме — выжывае пасьля атамнага выбуху (!), вядзе рукапашныя баі, расшыфроўвае піктаграмы й ганяе на матацыклах. Толькі цяпер ягоныя супернікі не нацысты, а камуністы.

Калярытная Ірына Спалко ў чорных пальчатках да локця і з шабляй, Герой Сацыялістычнай працы, якая на загад «вялікага Сталіна» швэндаецца па сьвеце ў пошуках паранармальных артэфактаў — гэта падарунак ад Кэйт Бланшэт, за што камуністы мусяць паставіць ёй помнік. Ніводная сталіністка на экране не была такой гратэскна-стылёвай, падцягнута-ваяўнічаю і апантанаю. «Дыцятко мое!» — схіляецца яна над муміфікаванымі парэшткамі пачвары, зь ледзяным позіркам загадвае забіць ворага й гарыць сінім полымем у неадольнай празе «ведаць усё».

Папрокі за недасканалую ўкраінскую мову (у карузьлівым расейскім дубляжы), закіды за неадпавeconнасьць датам (які Сталін у 57-м годзе!) і зьдзiўленьне, што ў дзікіх лясох гэбоўцы носяць адпрасаваную савецкую форму — адкідаюцца.

Стужка Сьпілбэрга — атракцыён зь людажэрамі-мурашамі, баявымі малпамі (прывітаньне «Тарзану»), ашчэранымі муміямі й іншапланэтнымі таямніцамі.

У забаўляльным кактэйлі дасьціпныя сямейныя звады (Карэн Алэн — Мэрыян зь першай часткі), намёкі на «Бясклапотнага ездака» — і галаваломныя аўтамабільныя трукі, якія Форд выконваў сам. І хаця нестае часам былога маладзевага шарму, сыпсваць Індыяну Джонза зарана. Ягоны сын — Шая ЛаБаф з «Трансформэраў» — не дарос да сьлыннага капелюша археоляга.

**Андрэй Расінскі**

# Як вывучаць гісторыю роднага краю

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Парадавала Міністэрства адукацыі з геніяльным праектам — адмяніць прадмет «Гісторыя Беларусі» і вывучаць яе дадаткам да Сусьветнай. Ідэя адпадная, аднак усё адно патрэбна капуста, каб тыя кніжкі друкаваць. Выхад адзіны — вывучаць гісторыю Бацькаўшчыны ў рамках прадмету «Фізкультура». Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Дыялёгі з школьнага жыцьця.

### У школьным калідоры

— Што ў нас там зараз?

— Гісторыя ФізБеларусі.

— Слухай, а можа, сачкануць. Я дамашку не зрабіў. Што задавалі?

— Скокі і падцягваньне пра пачатак Вялікай Айчыннай.

— Трасца, завал поўны. Фізгіструк абавязкова да мяне дакалупаецца. Пачне мараль чытаць: Вова, калі ня будзеш займацца гісторыяй, станеш тоўстым, як той Маргуноў. Яшчэ прымусіць пасьля ўрокаў скакаць.

— Можа, пасьпееш у мяне перакатаць?

— Давай!

— Глядзі, як я скачу. Раз-два-тры…

### Настаўніцкая

— Сяргей Пятровіч, чаго ў вас такі стомлены выгляд? Вы ж гістфізрук? У вас жа на гістфаку з ранку да вечара ладзілі ўсякія археалягічныя раскопкі на брусах, на сьвежым паветры.

— Ды вось, кляса дасталася мне зусім дурная. Ніхто ня ведае нават, чыё імя носіць лінія Сталіна. Давялося тры разы асабіста на канат караскацца.

— От жа ліха, расьце генэрацыя! Хутка на пытаньне «Ў якім годзе мы перамаглі фашыстаў?» будуць плыць батэрфляем.

— І не кажыце. Хочацца кінуць гэтую школу! Увесь наш выпуск з гістфаку пайшоў у спэцназ і не шкадуе.

— А чаго вы не сыходзіце?

— Ды, ведаеце, люблю я гісторыю роднага краю. Гісторык я па прызваньні: калісь у дзяцінстве моцна па галаве далі.

### Клясная аўдыторыя

— Пачынаем бацькоўскі сход! Буду казаць шчыра і проста. Дарагія бацькі, нам патрэбныя новыя гістарычныя снарады ў гістзалю: просім усіх здаць па дваццаць тысяч.

— Ды што ж гэта дзеецца? Мы ж толькі ў мінулым месяцы скідваліся на гэты снарад, як ён там завецца, — «гістарычны казёл».

— А што скажаце рабіць, шаноўныя бацькі? Мы ідзем да рынку. Гэта рэаліі. А гісторыю роднага краю дзецям ведаць трэба, як той Шварцэнэгер.

### Дырэктарская

— Праходзьце, шаноўны. Я наконт вашага сына. Ён зноў сарваў урок хіміі. Хлопец ён, прызнацца, не благі. Нават часам малайчынка. Перамог на гарадзкой алімпіядзе з гісторыі Беларусі: заваліў таго хлопца зь пятай школы апэркотам ужо ў трэцім раўндзе. Аднак гэта не дае яму права зрываць навучальны працэс. Што вы самі думаеце наконт ягоных жыцьцёвых плянаў?

— Я вам шчыра, таварыш настаўнік, скажу — ёлупень ён. Я з жонкай днямі на працы, а ён вольны. І нічым, акрамя гісторыі Беларусі, не цікавіцца. Я думаю, ён гісторыкам стане. Можа, яму нават крапавы дыплём дадуць...

— Прабачце, шаноўны, тут па мабіле турбуюць, з самога міністэрства званок. *(Па тэлефоне).* Так, слухаю. Што? Якая ідэя? Скасаваць прадмет роднай мовы і вывучаць яе ў рамках матэматыкі?! Можа, і нішто сабе — з пункту А ў пункт Б выйшаў «субстантываваны прыметнік у родным склоне, утвораны суфіксальным спосабам», да яго насустрач з пункту Б «непераходны дзеяслоў закончанага трываньня ў прошлым часе». Разьлічыць — у якім пункце яны сустрэнуцца з катангенсам, калі «выклічнік прайшоў тую дыстанцыю за тры гадзіны». Слухайце — нядрэнная ідэя, таварыш Радзькоў. Я — за.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Адначасова з самітам кіраўнікоў урадаў СНД у Менску праходзіў Летні саміт катоў.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ



Халерныя бактэрыі, нарысаваныя ў 1500 разоў большымі, як яны ёсьць.

**«Наша Ніва». №20. 1908**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі — **старонка 9.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПАДЗЯКІ

**Шчыры дзякуй** Алесю Мазаніку за падтрымку. Плёну і посьпеху ў працы на БелЭкспа. Алесь

### КНІГІ

**Прапануем** «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль, інш. «Гоман» розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru

**Шукаем кнігі**, матэрыялы па гісторыі: Сярэднявечча, ВАВ, Напалеонаўскі пэрыяд, Урбан «Старажытныя ліцьвіны». Т.: (029) 753–91–96

### ЗДАМ, ПРАДАМ

**Здаю кватэру** для маладой беларускамоўнай сям'і. 1–пакаёўка, бяз мэблі, з тэлефонам, вул.Багдановіча, блізка ад мэтро. 250 у.а.+камунальныя+дамова. Т.: (029) 524–65–95, (029) 192–03–21

**Прадам** за 36 тыс. лецішча (цагляны дом 105 кв. м.(недабуд на 35%), з надзелам 6 сотак (1 км. ад МКАД)). Ёсьць крама, электрычнасьць, вада, хуткая пэрспэктыва газу ды ўваходжаньня ў склад Менску (з правам прапіскі); ходзяць менскія аўтобусы ды маршрутկі. Т.: (029) 576–74–29. Магчымы гандаль ды абмен.

**Прадаецца аднапакаёвая** кватэра па вул. Усходняя ў Менску, 4 паверх уцепленага дому. Мэталічныя дзьверы, шклопакеты, вокны ў парк, балькон зашклёны, сутарэньні, добры стан. Т.: (029) 754–62–34, (029) 335–62–42

### СУСТРЭЧЫ

**Паважаныя выпускнікі** фізычнага факультэту БДУ, гады навучаньня 1953–1958! Запрашаем вас на сустрэчу выпускнікоў! Сустрэча плянуецца на 5 чэрвеня 2008 г. Збор а 15–й на двары БДУ. Т.: (029) 171–80–05 (Галубовіч Валя), (029) 772–94–94 (Кірдун Ева), kirduneva@tut.by

### АДПАЧЫНАК

**Шукаю каго-небудзь** у кампанію для актыўнага адпачынку ў горадзе Судак (Крым) пасьля 20 чэрвеня. Нас чакае мора і горы. Т.: 280–81–98. Ігар

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Дапаможам падрыхтаваць** тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

**© НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.05.2008.
Замова № 2816.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.